Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Ц... Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Рукапісы, якія не прымаюцца, назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. • 3 • — 2 р. 70 к. • 6 • — 4 р. — к. • 1 год — 8 р. — к. Змена адрасу: іншагародняя — 20 к. мясцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок пашпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок пашпарэлі паперад тэксту 1 р. — к. За радок пашпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Скідкі на 50 проц. дазволены. Зыш тарыфу бароцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 радок . . . 35 кап. За кожны дадатковы . . 15 „ Беспрацоўн. і сяброў прафсаюзаў за радок . . 15 „ За кожны дадатковы . . 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газеты, ва ўсіх аддаленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газеты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 год выданьня.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА.

№ 185 (2674) Чацьвер, 15-га жніўня 1929 г.

154 кр. "Савецкая Беларусь" ОДЕССА, Пастера 13 Дзяржб. Госуд. публичн. биб-ка. студз. съезж. адзін экз.

УПЕРАД ДА ПЕРАМОГІ.

Баярская Румынія заліта рабочай крывёй. Над гарнякамі Жылаўскай даліны „дэмакратычны“ ўрад Маніу ўчыніць суровую расправу. Дружныя воплескі правакатараў II Інтэрнацыяналу заглушылі трэскатню кулямётаў. „Правадары“ „працоўнай“ буржуазеі вельмі задаволены, што калега Маніу выбраў „просты“ вызначаны Цэргібэлем шлях—кулямёты, панцырнікі, каб прыдушыць рабочы рух. Маска „дэмакратызму“ сарвана. Наглы твар азьвярэлага фашызму паўстаў ва ўсёй агіднай „велічы“ і „прыгожасьці“. 32 рабочы забіты, сотні цяжка параненa. З параненых ужо некалькі чалавек памерла, іншыя-ж змагаюцца са сьмерцю.

Румынская с.-д. партыя II Інтэрнацыяналу адмежавалася маральна і палітычна ад гэтаўчых барацьбітоў—жылаўскіх бастуючых гарнякоў. Партыя здраднікаў фактычна ўжо даўно зьяўляецца агентурацю буржуазеі ў рабочай клясе; і тое, што яна цяпер „адмежавалася“ ад бастуючых—дапаможа рабочым хутчэй пазбавіцца тых ілюзій, якія часткова яшчэ заставаліся ў рабочай клясе.

У сучасны момант абвостранай клясавай барацьбы няма трох плыняў—рэвалюцыйнай, „дэмакратычнай“ і контр-рэвалюцыйнай, а ёсьць толькі дзьве. Контр-рэвалюцыйная з усімі буржуазнымі групоўкамі, уключаючы і сацыял-дэмакратыю, і—камуністычная бальшавіцкая партыя, за якой стаіць увесь рэвалюцыйны пралетарыят і працоўнае сялянства.

Дзеля гэтага кожнае выступленьне рабочай клясы супроць буржуазнага ладу ёсьць выступленьне і супроць с.-д.

Вось чаму „дэмакратычны“ ўрад, на чале якога стаіць селянін Маніу, даў загад жандармэрыі «самымі рашучымі мерамі ліквідаваць забастоўку і ўстанавіць парадак і спакой».

Кату „сялянскаму“ міністру мала крыві тысяч забітых, пакалечаных, засуджаных у астрогі. Ён патрабуе яшчэ больш, каб утрымацца на падгнілых хісткіх устоях. За ўсякую цану ўтрымаць панаваньне капіталістаў—вось мэта правадыроў сацыял-дэмакратычнай партыі. Дарваўшыся да дзяржаўнага карыта, сацыял-здраднікі гатовы самым лютым тэрорам прыдушваць рэвалюцыйны рух, абы затрымаць уладу ў сваіх руках.

Трэба ведаць безчалавечныя ўмовы, у якіх жыве румынскі рабочы каб зразумець, да якога жудаснага становішча даведзены забаставаўшыя гарнякі. Пры 10-12-цігадзінным дні працы румынскі рабочы зарабляе ад восьмай да трэцяй часткі таго, што яму неабходна для пражыцьця.

Забастоўка распачалася 3-га жніўня. Жылаўскія гарнякі высунулі выключна эканамічныя патрабаваньні: павялічэньне заработку і ўвядзеньне 8-мі гадзіннага дню працы. 6-га жніўня Жылаўскі раён быў запоўнены жандармэрыяй, паліцыяй і войскам, якія зараз-жа распачалі «ліквідацыю» забастоўкі, пусьціўшы ў ход зброю.

Загад «сялянскага» ўраду Маніу быў выкананы на „яць“. Рабочай крывёй заліта Жылаўская даліна. Каля трупаў забітых стаяў „пераможац“ паліцэйскі жандар, не падпускаючы да трупаў таварышоў па працы і барацьбе. Забітых выдалі сваякам (жонкам, бацьком), якія пахавалі іх пад узмоцненай вартай пры забароне дэманстрацый. Сотні параненых адвезена ў больніцы і некалькі сотняў закаваных у кандалы, зьбітых да бяспрытомнасьці, ледзь жывых, пасаджана ў астрог.

Палкоўнік, якому была даручана „ліквідацыя“ забастоўкі, абвясьціў у друку, што ў Жылаўскім раёне настаў «поўны спакой», што магнаты і банкіры могуць спаць спакойна, бо вораг разьбіты.

«Адважны» ваяка па сваёй дурасьці думаў, што застрэліўшы паўсотні і некалькі сотняў параніўшы бязбройных рабочых, ён спыніць рэвалюцыйную хвалю, якая з кожным разам з усё большаю сілаю ўзьнімаецца вышэй і вышэй.

Аднак, назаўтра ёй пераканаўся, што да поўнага спакою яшчэ далёка.

Гарнякі, ня гледзячы на крывавую лазьню, на разгул паліцэйскага тэрору, на непамерна цяжкія ўмовы барацьбы, змучаныя голадам і непамернай эксплёатацыяй, заявілі, што будуць змагацца да пераможнага канца. Капальням пагражае развал. Забастоўка трывае далей.

Рабочыя гарнякі выступілі як авангард працоўных і прыгнечаных мас. Супроць сябе яны маюць адзіны фронт буржуазеі і сацыял-фашыстаў. За рабочымі гарнякамі стаяць рабочыя Румыніі і ўвесь міжнародны пралетарыят.

Сёньня тэлеграф паведаміў, што румынскія сяляне закідалі каменьнямі „усьмірыцеляў“. Улада ахрысьціла гэты «выпадак» „камуністычным выступленьнем“. Прыняты рашучыя меры для ліквідацыі «бунту» У дзень пахаваньня ахвяр жылаўскай расправы, рабочыя мэталёўцы аб'весьцілі забастоўку.

Румынскі пралетарыят разам з працоўным прыгнечаным сялянствам уступіў у рашучую барацьбу з фашысцкім урадам. У гэтай барацьбе рабоча-сялянскі саюз выйдзе пераможцам.

У САЮЗНЫХ РЭСПУБЛІКАХ.

АМЭРЫКАНСКІЯ ЖУРНАЛІСТЫ АБ СССР.

МАСКВА, 12-8. У Маскву вярнулася амэрыканская гандлёва - прамысловая дэлегацыя, якая наведала буйнейшыя раёны СССР. Сярод членаў дэлегацыі група амэрыканскіх журналістаў, якія азнаёміліся з вытворчасьцю, умовамі працы і быту рабочых у СССР, журналісты выказалі сваё зьдзіўленьне вялічэзнасьцю рэканструкцыйнай праграмы СССР сваю глыбокую ўпэўненасьць у посьпеху пяцігодкі і захапленьне „здаровай“ мудрай і шляхетнай палітыкай савецкай улады. Журналісты таксама падкрэсьлівалі набліжэньне эры савецка-амэрыканскага супрацоўніцтва.

Міжнародная салідарнасьць узмацняецца.

КАЗАНЬ, 12-8. Рабкоры амэрыканскай газэты „Дэйлі Уоркэр“ зьвярнуліся да рабочых Татарыі з заклікам пратэставаць супроць надыходзячай расправы тэкстыльных прамыслоўцаў Злучаных Штатаў над 15 лепшымі барацьбітамі-тэкстыльшчыкамі Гастоніі.

У шмат якіх буйных прадпрыёмствах Казані адбыліся ў зьвязку з гэтым спэцыяльныя сходы, якія горача віталі пралетарыят Амэрыкі і яго перадавых барацьбітоў. Сход рашуча патрабуе вызваленьня арыштаваных тэкстыльшчыкаў.

Камісія па Аўтабуду.

НІЖНІ-НОЎГАРАД, 11-8. Учора ў Ніжні-Ноўгарад прыехала ўрадавая камісія па аўтабудове ў складзе Нам. Старшыні ВСНГ СССР т. Межлаўка, члена прэзыдыуму Дзяржпляну Асінскага і начальніка Галоўмашбуду Талакондава. Разам з камісіяй у Ніжні-Ноўгарад прыехалі галоўны дырэктар заводаў Форду Сарэнсэн, камэрцыйны дырэктар Рокксэльман, кіраўнік лёндзанскім аддзяленьнем фірмы Форду—Пэры і кіраўнік бэрлінскім аддзяленьнем—Карлсэн.

Урадавая камісія і амэрыканскія прадстаўнікі наведалі Балахну Сормава і выяжджалі ў вёску Манастырку для агляду вучастку, абранага для пабудовы аўтазаводу.

Дасягнута поўная згода.

МАСКВА, 14-8. На пасяджэньні калегіі Аўтастрою, разам з прадстаўнікамі амэрыканскай фірмы Косьціў і Космут Брайантам і містэрам Лёўманам было ў асноўным скончана абмеркаваньне праэкту дагавору з памянёнай фірмай аб тэхнічным кіраўніцтве будаўніцтва Аўтазаводу—гіганта ў Ніжнім Ноўгарадзе. Дасягнута амаль поўная згода па ўсіх пунктах дагавору.

На ініцыятыве начальніка Сельмашстрою—Глебава-Аралава, была зроблена прапанова міністру Брайанту ўзяць на сябе распрацоўку праэкту спэцыяльнага цэху да выпуску камбайнаў пры Растоўскім заводзе Сельмашстрою.

Таварыская вячэра.

МАСКВА, 12-8. У Вялікай Маскоўскай гасьцініцы адбыўся банкет у гонар амэрыканскай гандлёва-прамысловай дэлегацыі, якая вярнулася ў Маскву пасьля аб'езду шэрагу раёнаў СССР. У банкеце прымалі ўдзел каля 70 прадстаўнікоў амэрыканскіх гандлёвых і прамысловых фірм, працаўнікі НК Замежных Спраў СССР і Усесаюзнай Заходняй Гандлёвай палаты. Пасьля таварыскай вячэры госьці падзяліліся сваімі ўражаньнямі.

НА 6 МІЛЬЯРДАЎ ДАЛЯРАЎ.

НЬЮ-ЁРК, 9-8. Фэдэральны рэзэрвовы банк штату Нью-Ёрк (дзяржаўны) павысіў вучотны процант в 5 да 10 проц. Трэба адзначыць, што за тыдзень з 1-га па 7-е жніўня банк прадставіў крэдыты на нябывалую да гэтага часу суму ў 6 мільярдаў даляраў. За тойжа перыяд мінулага году суме прадастаўленых банкам крэдытаў не перавышала 4-х мільярдаў даляраў.

* * *

ЛЁНДАН, 9-8. Рэйтэр паведамляе: У лёнданскіх банкаўскіх колах абгаварваюць пытаньне аб тэрміновым павялічэньні разьмераў процанту па банкаўскіх крэдытах.

Водлуг прыватных паведамленьняў ангельскі банк паведаміў іншыя банкі, што па думцы яго кіраўнікоў павялічэньне вучотнага процанту фэдэральным банкам штату Нью-Ёрк не павінна абавязкова пацягнуць за сабой павялічэньне вучотнага процанту Англіі.

Напад на нашых пагранічнікаў.

ЗА АПОШНІЯ ДНІ Ў НЕКАЛЬКІХ ПУНКТАХ САВЕЦКА-КІТАЙСКАЙ МЯЖЫ БЫЛО З НАШАГА БОКУ НЕКАЛЬКІ ЗАБІТЫХ І ПАРАНЕНЫХ КІТАЙСКІМІ БЕЛАБАНДЫТАМІ.

Белабандыты нападаюць на тэрыторыю Савецкага Саюзу.

Ад самага пачатку канфлікту на Ўсходня-Кітайскай чыгунцы пры непасрэднай дапамозе кітайскага войска, белагвардзейцы сыстэматычна абстрэльвалі нашы прымежныя заставы і мірнае насельніцтва.

За апошнія дні ў некалькіх пунктах было зарэгістравана з нашага боку некалькі забітых і параненых. Абнаглёўшыя белабанды і кітайскія часьці не абмяжоўваючыся абстрэлам сямтам нават спрабавалі перайсьці нашу тэрыторыю.

У раёнах Благавешчанску, рэчкі Сунгары і возера Ханка, белагвардзейцы пры дапамозе кітайскага войска напалі на пагранічнікаў. Рашучым адпорам нашага войска нападаўшыя былі разагнаны.

ШМАТ ЗАБІТЫХ І ЗАМУЧАНЫХ.

ТОКІЁ. 3 Харбіну ад 12 жніўня паведамляюць: за ўвесь учарашні дзень арыштавана і выслана 166 савецкіх грамадзян, прычым яны ні ў чым не абвінавачаны. Сярод высланых ня толькі служачыя Ўсходня-Кітайскай чыгункі, але і савецкія грамадзяне, якія ня маюць ніякага дачыненьня да чыгункі. Нікому не дазволена ліквідаваць справы і разьвітацца са сваякамі. За апошнюю ноч на станцыі Пагранічная арыштавана 53 савецкіх грамадзяніна.

Арышты ўчыняюцца па ўсіх раёнах і не падаюцца вучоту. Большасьць грамадзян абвінавачваецца ў самазвальненьні, якое прыраўніваецца да забастоўкі. У сучасны момант большая частка савецкіх грамадзян кінула працу на Ўсходня-Кітайскай чыгунцы. Усе яны вельмі пакутуюць. Прысланы весткі, што шмат савецкіх грамадзян закатавана і забіта на кітайскім панцырніку.

Яшчэ адна група высланых.

ЧЫТА, 13-8. Сёньня прыбыла група рабочых і служачых У-К чыгункі, звольненых са станцыі Манчжурыя і Харбін у колькасьці 38 чалавек. Усе яны былі высланы на 86 разьезд пад канвоем паліцыі. З-за адмаўленьня прапусьціць поезд у Манчжурыю сядзяць яшчэ 40 сем'яў, звольненых у Харбіне і 60 у Манчжурыі. Сярод прыбыўшых адзін кітаец, які ўцёк ад прасьледваньня паліцыі.

Кітайцы ў Манчжурыі ўвесь час ня спыняюць вымяшчэньні і звальненьні рабочых і замену адказных служачых кітайцамі. Начальнік станцыі, а таксама дэпо назначаны кітайцы. У Чыту прыбыла група моладзі з станцыі Манчжурыя ў колькасьці 7 чалавек, якія служылі ў дэпо і ў майстэрнях станцыі. 5 жніўня яны ўсе былі арыштаваны ў розных частках гораду за падачу заяў аб адмаўленьні ад працы на У-К чыгунцы і жаданьні паехаць у СССР вучыцца. Пасьля арышту яны былі пасаджаны ў падвал, дзе прасядзелі сутки, а раніцаю над канвоем былі высланы на 86 разьезд.

Хлусьня кітайскага друку.

ПЭЙПІН, 13-8. Газэта «Суа-Пэ-Жы-Бао» паведамляе, што з быўшымі кітайскімі грамадзянамі ў СССР абыходзяцца вельмі сурова. Водлуг слоў газэты, кітайскія грамадзяне ў Хабараўску былі высланы, нібыта, у Маскву, (?), прычым ім нават ня дадзена харчу на дарогу.

Далей газэта паведамляе, што Ванчжэн-Цін раіў міністэрству замежных спраў рассылаць пабольш тэлеграм аб дрэнных абыходзінах з кітайскімі грамадзянамі ў СССР.

Паведамленьне ТАСС не агалашаюць.

ТОКІЁ, 13-8. Тэлеграма ТАСС з адхіленьнем завярэньняў У-Чжао-Чуи, разасланая японскім газэтным агенцтвам Сімбун Рэнго, ні ў адной газэце не надрукавана.

„Высокае начальства“.

ЧЫТА, 13-8. За апошнія дні ў Манчжурыю значна пачалі прыбываць афіцыйныя прадстаўнікі Японіі, Амэрыкі і іншых краін. Гэтымі днямі для агляду вайсковых часьцей прыяжджала высокае начальства.

У гэтыя дні ўзмацніліся бязчынствы афіцэраў, яны хапалі ўсіх кітайцаў, апраналі іх у вайсковую форму і накіроўвалі пад канвоем у часьці, каб папоўніць іх пасьля масавага дызэртырства і паказаць поўную наяўнасьць вайсковых злучэньняў. Манчжурыя ўсё яшчэ знаходзіцца на ваенным становішчы.

БАРАЦЬБА АБВАСТРАЕЦЦА.

Китаржнымі прыгаворамі буржуазея хоча задушыць рэвалюцыйны рух.

Сяляне супроць усьмірыцеляў.

ВЕНА, 13-8. Як паведамляюць з Бухарэсту, часьці вярхоўнага палка, якія праводзіў навучаньне ў аколіцах Кішынёва, былі закіданы каменьнямі, быццам, абстраляны мясцовымі сялянамі ў Апуасе. Сьцьвярджаюць, быццам мелася „камуністычнае выступленьне“.

Хінчын забіты паліцыяй.

ВЕНА, 13-8. Югаслаўскае тэлеграфнае агенцтва Авала паведамляе, што арыштаваны ўчора за нелегальную дзейнасьць камуніст Хінчын скончыў у Саарскай турме жыцьцё самагубствам, выкінуўшыся з вакна.

Аўстрыйскі рабочы друк выказвае падазрэньне, што Хінчын забіты паліцыяй.

Даць дапамогу палітвязьням.

ПАРЫЖ, 12-8. Француская сэкцыя Мопру агаласіла ў „Юманітэ“ адозву рабочых, заклікаючы аказаць усямернае падтрыманьне абвешчанай Мопрам кампаніі грашовых збораў у карысьць арыштаваных у зьвязку з правядзеньнем міжнароднага чырвонага дню.

УЗДЫМ РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ ХВАЛІ.

ВЕНА, 13-8. Сямігрэдзкія газэты паведамляюць, што заслухаўшы даклад камісіі, якая езьдзіла на месца крывавых сутычак у Лупэнах, рамынскі ўрад пастанавіў рэарганізаваць вугольную прамысловасьць Жылавы ў сэнсе яе мілітарызацыі. Прэфэкту паліцыі ўрад запрапанаваў падаць у адстаўку.

У дзень пахаваньня забітых у Бухарэсьце адбылася трохгадзінная забастоўка пратэсту на вялікім мэталёвым заводзе «Лемэтр».

Камуніст Паукер, які выступаў на сходзе бастуючых, быў арыштаваны і вызвалены толькі на другі дзень.

„Рабочыя“ міністры просяць.

ЛЁНДАН, 12-8. Орган рабочай партыі «Дэйлі Геральд» паведамляе, што на нарадзе з прадпрыёмцамі баваўнянай прамысловасьці Макнадальд заклікаў іх заняць больш прымірэнчую пазіцыю ў адносіне да рабочых. Паводле вестак газэты, Макдональд найстайваў, каб прадпрыёмцы згадзіліся перадаць на трацейскі разгляд пытаньне «аб разьмерах скарачэньня заработку». Як вядома кіраўнікі прафсаюзаў тэкстыльшчыкаў і шэрагу іншых ужо згадзіліся на такі арбітраж, але рабочыя вельмі незадаволены з гэтага і чуюцца ўсюды рашучыя пратэсты.

Выканком незалежнай рабочай партыі ўхваліў рэзалюцыю патрабуючую скліканьня надзвычайнай сэсіі парламанту, якая павінна даць ўраду неабходныя паўнамоцтвы для прыняцьця мер у зьвязку з становішчам з баваўнянай прамысловасьцю.

Міністр аховы здароўя Грынвуд разьлаў абежнік мясцовым апекаваньням для бедных.

Абежнік, гаворачы аб „чалавечнасьці“ забараняе выдаваць дапамогі на беднасьці рабочым, падпаўшым лёкаўту. Дапамогі-ж па беспрацоўю згодна ўстаноўленай ў Англіі практыцы, лёкаўтаваным рабочым, роўным чынам, не выдаюцца.

Астрогі папаўняюцца.

ГЭВЭЛЬ, 12-8. Скончыўся допыт 36 рабочых тэлеграфу, арыштаваных па анты-ваенным канфэрэнцыі ў Багеміі. Часьля 20-цідзённага арышту ўсе арыштаваныя, за выключэньнем трох, вызвалены. Трое застаўшыхся пад арыштам абвінавачваюцца ў незаконнай чынасьці.

Рабочыя Добруша паказалі прыклад клясавай сьвядомасьці.

Прэзыдыум ВСНГ Бел. паслаў калектыву рабочых Добрускай папяровай фабрыкі „Гэрой Працы“ наступную тэлеграму:

— У зьвязку з пускам фабрыкі пасьля аварыі, прэзыдыум ВСНГБ адзначае гэраічнае напружаньне калектыву рабочых і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу, дзякуючы чаму пры дапамозе сялянства вакольных вёсак фабрыка была пушчана ў найкарацейшы тэрмін.

У гэтай справе дабрушане паказалі прыклад клясавай сьвядомасьці на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

Рабочыя і сяляне БССР павінны ведаць сваіх лепшых барацьбітоў па сацыялістычнай будоўлі.

Рэалізацыя III пазыкі індустрыялізацыі.

Падпіска на 3-ю пазыку па акругах.

Згодна веотак НКФ падпіска па асобных акругах Беларусі дасягнула наступных лічбаў: Менская—2 млн. руб., Гомельская—1381 тысяча р., Віцебская—1 млн. руб. Аршанская—382 тысячы руб.

Менскія рабочыя падпісваюцца на 3-ю пазыку.

Рабочыя заводу „Дрэвзапрацоўшчык“ падпісаліся на 25 тысяч рублёў.

* * *

Рабочыя шпалернай ф-кі—на 8750 руб.

* * *

Рабочыя абутковай майстэрні Гандельстрою—на 8555 р.

* * *

Рабочыя і служачыя Дзяржгандлябелу—на 11600 руб.

* * *

Супрацоўнікі Белмедторгу падпісаліся на 6500 руб.

* * *

Рабочыя б. п.-к. пікароў—на 9825 руб.

125 проц. у пазыку дзяржаве.

Рабочыя Менскага працкалектыву шорнікаў у адказ на прозіскі міжнародный буржуазеі на сваім сходзе паотанавілі падпісацца на пазыку „ня менш, як на 100 проц. месячнага заработку. У працэсе ходу падпіскі, адзін перад другім рабочыя падпісваліся на 125-200 проц. месячнага заработку. У выніку з 63 чал. на пазыку падпісалася 58, на 5245 руб. у той час, як зарплата па ўсяму калектыву складае 4500 руб. Такім чынам, рабочыя далі ў сярэднім больш як 125 проц. месячнага заработку ў пазыку дзяржаве.

Звыш 100 проц. месячнага заработку.

З 124 працаўнікоў Наркамфіну на 3-ю пазыку індустрыялізацыі падпісалася 113 чалавек на 15625 руб. Між тым, зарплата ўсяго апарату НКФ у месяц складае 15454 руб. Такім чынам падпіска на пазыку ў калектыве Наркамфіну дала нуды больш месячнага заработку падпісаўшыхся.

У кіраўніцтве працкалектывамі.

У кіраўніцтве працкалектывамі Менскай акругі працуе 26 чалавек. Пакуль што на пазыку падпісалася 20 працаўнікоў, а рэшта ў водпуску. Падпіска дала 2840 руб., а зарплата ўсяго калектыву ў месяц складае 2335 руб.

Падпіска ў Наркампрацы.

З 39 працаўнікоў Народнага Камісарыяту Працы БССР на 3-ю пазыку індустрыялізацыі падпісаліся 21 чалавек на суму ў 3275 руб. Між тым месячная зарплата ўсяго калектыву працаўнікоў складае 2982 руб. Шмат хто падпісаўся на 150-200 проц. месячнага заработку.

Вынікі добрыя.

Рабочыя працкалектыву па вырабу мэблі ў ліку 54 чалавекі падпісаліся на пазыку індустрыялізацыі на 5205 руб., што складае ў сярэднім больш 100 проц. месячнай зарплаты падпісаўшыхся. Вынікі можна лічыць добрымі, але перад месцкомам стаіць задача ўцягнуць у падпіску і адпускнікоў, калі яны вернуцца на работу.

Таксама больш 100 проц.

З 75 працаўнікоў Лесбелу, месячная заработная плата якіх складае 10455 руб., на пазыку індустрыялізацыі падпісалася 65 чалавек. Падпіска сярод іх дала звыш 9000 руб.

Трэба падцягнуцца.

У Менскім мікрабіялёгічным інстытуце працуе 39 чалавек, якія ў месяц зарабляюць 2715 руб. На 3-ю пазыку індустрыялізацыі падпісалася толькі 26 чалавекі, на 1690 руб. Неабходна ў падпіску ўцягнуць увесь калектыў і мінімум на 100 проц. месячнага заработку.

Работніцы дому дзіцяці—на 1985 руб.

Работніцы і служачыя Менскага дому дзіцяці № 1, у ліку 60 чалавек сабралі падпіскі на новую пазыку індустрыялізацыі на суму ў 1985 руб.

Разам з усімі.

Працаўніцы трэцяй дзіцячай кансультацыі на сваім сходзе заявілі, што яны разам з усімі працоўнымі на наглы напад кітайскай ваеншчыны адкажуць дружнай падпіскай на 3-ю пазыку індустрыялізацыі. Падпісаліся 15 чалавек на 100 проц. месячнага заработку.

Рабочыя транспартнікі ўдзельнічаюць у рэалізацыі.

На толькі ўдзельнічаюць, але і паставілі сабе задачу—100 проц. месячнага заработку даць у пазыку дзяржаве на індустрыялізацыю краіны. Слова ў транспартнікаў не разыходзіцца са справай,—падпісваліся хто на 100, хто на 125, а хто і на 150 проц. месячнага заработку.

На індустрыялізацыю краіны.

Супрацоўнікі апарату Белпайгандлю ў ліку 65 чал. падпісаліся на 3-ю пазыку на суму 6.210 рублёў, што складае 100 процантаў заработнае платы.

* * *

Супрацоўнікі Белкамунбанку ў ліку 45 асоб падпісаліся на 3-ю пазыку на агульную суму 5435 рублёў. Не падпісалася ўсяго тры супрацоўнікі, якія знаходзяцца ў адпачынку. Падпіска складае 115 проц. месячнага заробку.

* * *

Супрацоўнікі Пераробчага Спажывецкага т-ва, Тураўскага раёну, Мазырскае акругі, сумесна з супрацоўнікамі Пераробчага сельсавету падпісаліся на 3-ю пазыку на суму 380 рублёў і выклікаюць зрабіць па іх прыкладу супрацоўнікаў усіх спажывецкіх таварыстваў і сельсаветаў Тураўскага раёну.

* * *

Супрацоўнікі „Белтромтрэсту“ у ліку 18 чалавек падпісаліся на 3-ю пазыку на агульную суму 3.111 рублёў, што складае 114 процантаў заработнай платы за месяц.

* * *

Рабочыя і служачыя Дрысенскага Лясьніцтва падпісаліся на 3-ю пазыку на 139 процантаў сваёй пэнсіі, на суму 1095 рублёў і выклікаюць падпісацца на столькі-жа процантаў супрацоўнікаў Акрэя Полацкай акругі, Асьвейскае, Вальнецкае, Полацкае, Вобальскае, Сотнінскае і Клясьніцкае лясьніцтвы.

* * *

Супрацоўнікі Менскага аддзяленьня пошты ў ліку 350 асоб падпісаліся на 3-ю пазыку на агульную суму 26.000 рублёў. Падпіска працягваецца.

* * *

Рабочыя 2-га працкалектыву абутнікаў, у ліку 72 асоб падпісаліся на 3-ю пазыку на суму 8031 руб. Падпіска прадаўжаецца

ГААГСКІЯ СУПЯРЭЧНАСЬЦІ.

о-га жніўня ў Гаазе адчынілася, нарэшце, дыплёматычная рэпарацыйная канфэрэнцыя.

Насупярэч звычаю буржуазнай дыплёматыі, пры адчыненьні канфэрэнцыі на гэты раз ня меў месца афіцыйны аптымізм і друк усіх краін ня толькі ня ўтойваў глыбокіх супярэчнасьцяй, падзяляючых удзельнікаў канфэрэнцыі, а наадварот, узмоцнена падкрэсьліваў, што работы канфэрэнцыі німінуча зацягнуцца на месяцы.

І сапраўды, супярэчнасьцяй ня мала. Пасьля парыскае канфэрэнцыі экспэртаў, простым працягам якой зьяўляецца сучасная канфэрэнцыя ў Гаазе, супярэчнасьці ня толькі ня згладзіліся, але наадварот, абвастрыліся. Нічога дзіўнага, пагэтаму, што Гаагская канфэрэнцыя зацягнецца надоўга; дагаварыцца немагчыма, але таргавацца можна, і ёсьць аб чым.

Гэта абвастрэньне супярэчнасьцяй пасьля парыскай канфэрэнцыі тлумачыцца перш усяго тым, што зьмена ўраду ў Англіі прывяла да спробы, магчыма, безнадзейнай, знайсьці спосаб да англа-амэрыканскага зблiжэньня, хоць-бы за кошт некаторага паслаблеьня англа - францускіх сувязяй. Вось гэткая стаўка ўраду Макдональда які ў значна меншай ступені, чымся кансэрватыўны ўрад, схільны лічыцца з пратэстамі Францыі. І старанна затушоўваемыя да нядаўнага часу англа-францускія супярэчнасьці зараз выяўляюцца досыць яскрава.

На парыскай канфэрэнцыі Нямеччыне супроцьстаяў адзіны фронт Англіі, Францыі, Бэльгіі і Італіі. Праўда, гэты фронт даваў досыць часта глыбокія трэшчыны. Аднак, шляхам узаемных уступак па другарадных пытаньнях адзіны фронт параўнаўча лёгка аднаўляўся. У баку ад гэтага фронту і для бачнасьці над ім, у якасьці агульнага трацейскага судзьдзі, сталі дэлегаты Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў, прадстаўнікі амэрыканскага банкаўскага капіталу. Становішча „сумеснага маклера“ палегчыла ім задачу правядзеньня на канфэрэнцыі іх мэтаў. Парыская канфэрэнцыя амаль ва ўсім падпарадкавалася волі Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў. Справа, зразумела, не абышлася без некаторых кампрамісаў, пры правядзеньні якіх Паўночна-Амэрыканскія Злучаныя Штаты ахвотней усяго ішлі насустрач Нямеччыне, а з ваенных крэдыторамі—Францыі.

Іншая справа ў Гаазе. Тут адзіны фронт саюзьнікаў шмат страціў у сваёй спаянасьці. Крыху спрашчаючы становішча рэчаў на канфэрэнцыі, можна сказаць, што ў Гаазе супроцьстаяць адна другой дзьве групоўкі: англа-нямецкая, якую падтрымлівае „бесстароннi“ арбітр—Паўночна-Амэрыканскія Злучаныя Штаты, і франка-бэльгійска - італьянская. Аднак, было б зусім направільна ня ўлічваць, з аднаго боку, існуючыя ўнутры кожнай групы сурёзныя супярэчнасьці, а з другога, некаторую агульнасьць інтарэсаў, зьвязваючых асобных прадстаўнікоў розных груп, у прыватнасьці, Францыі і Англіі, Англіі і Італіі і г. д. Гэтыя супярэчнасьці па некаторых пытаньнях настолькі моцныя, што робіцца цяжка гаварыць аб дзьвюх групоўках.

Абставіны ў Гаазе даюць шырокія магчымасьці для ўсялякіх дыплёматычных манэўраў, якія німінуча прывядуць да таго, што работы канфэрэнцыі сапраўды зацягнуцца надоўга. Адначасова, гэтыя-ж абставіны акажуцца выключна спрыяючымі для Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў, для якіх сучасная канфэрэнцыя зьяўляецца новым этапам у ўзмацненьні іх фінансавай і палітычнай перавагі ў Эўропе. У кожным разе, Паўночна-Амэрыканскім Злучаным Штатам наўрад ці прыходзіцца баяцца, што Эўропе ў выніку Гаагскай канфэрэнцыі ўдасца аб'яднацца. Наадварот, усё гаворыць за тое, што эўрапэйскія супярэчнасьці толькі ўзмоцняцца. У прыватнасьці, ажыцьцяўленьне франка-нямецкага зблiжэньня, як асновы для стварэньня Пан-Эўропы, ня стане больш лёгкім, як ня стане і больш моцнай англа-францускай антанта.

Калі нават абмежавацца разглядам пытаньняў, якія афіцыйна стаяць у парадку дню Гаагскай канфэрэнцыі, дык і тады выяўляюцца глыбокія супярэчнасьці, падзяляючыя яе ўдзельнікаў.

Водлуг афіцыйных заяў прадстаўнікоў эўрапэйскіх дзяржаў, пазіцыя асобных краін мае наступны выгляд:

Францыя.—Прыняцьце пляну Юнга бяз зьмен, у прыватнасьці без перагляду разьмеркаваньня нямецкіх плацяжоў паміж краінамі-крэдыторамі, прадугледжанага гэтым плянам. Мабілізацыя рэпарацыйнай часткі нямецкага доўга. Арганізацыя Рэйнскай кантрольнай камісіі, прынамсі да 1935 году. Вызначэньне гарантый безапаснасьці ня толькі на заходніх, але і ўсходніх межах Нямеччыны. Пры выкананьні пералічаных умоў—эвакуацыя Рэйнскай вобласьці. Пытаньні аб Саарскай вобласьці і калёніяльных мандатах Нямеччыны не ўваходзяць у кампэтэнцыю Гаагскай канфэрэнцыі. Месцазнаходжаньне рэпарацыйнага банку—Брусэль, функцыі банку абмяжоўваюцца і зводзяцца да ўчыненьня міжнародных разрахункаў па нямецкаму доўгу і агульна-эўрапэйскаму доўгу Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў.

Нямеччына.—Умовы прыняцьця пляну Юнга—эвакуацыя Рэйнскае вобласьці, урэгуляваньне пытаньняў аб Саарскай вобласьці і калёніяльных мандатах. Толькі ў выпадку ўрэгуляваньня пералічаных пытаньняў, Нямеччына згодзіцца ратыфікаваць плян Юнга. Ніякай кантрольнай камісіі на Рэйне не павінна быць. Плян Юнга, які ўжо і зараз уяўляе базу для далейшых перамоў аб даўгох, наўрад ці зможа праіснаваць звыш дзесяці гадоў. Рэпарацыйны бак—у Амстэрдаме, Базэлі ці Цурыху.

Англія.—Плян Юнга павінен быць перагледжан перш усяго ў частцы датычнай разьмеркаваньня нямецкіх плацяжоў паміж краінамі-крэдыторамі. Доля Англіі павялічваецца за кошт Францыі і Італіі. Ня гледзячы на ўзаемную сувязь паміж эвакуацыяй Рэйну, арганізацыяй рэйнскае кантрольнае камісіі і прыняцьцем пляну Юнга, эвакуацыя павінна быць праведзена магчыма хутчэй, прычым Англія пакідае за сабой права вывесьці сваё войска з Рэйнскае вобласьці, незалежна ад іншых акупуючых краін. Арганізацыя рэйнскае кантрольнае камісіі не абавязкова. Нямеччына мае права ўзьняць на канфэрэнцыі пытаньне аб Саарскай вобласьці. Пытаньне-ж аб калёніяльных мандатах не падлягае абгаварэньню канфэрэнцыі. Рэпарацыйны банк—у Лёндане.

Бэльгія.—Па асноўных пытаньнях гатова падтрымліваць Францыю.

Італія.—Плян Юнга прымаецца Італіяй пры ўмове, што ўсе астатнія дзяржавы згодзяцца яго ратыфікаваць у сучасным выглядзе. Па рэшта пытаньняў Італія захоўвае права вольных дзеньняў.

Паўночна-Амэрыканскія Злучаныя Штаты.—Афіцыйна ПАЗШ ухіляюцца ад абмеркаваньня пляну Юнга і выцякаючых з яго палітычных вынікаў. Неафіц

ПАСТАНОВА АБ'ЯДНАНАГА ПАСЯДЖЭНЬНЯ БЮРО ЦК І ПРЭЗЫДЫУМУ ЦКК КП(б)Б

ад 9-га жніўня 1929 году.

1. Адзначыць, што праведзеная органамі РСІ шырокая растлумачальная работа аб мэтах і задачах чысткі савецкага апарату, шляхам пастаноўкі дакладаў на сходах рабочых, служачых, працоўнага сялянства (выбары брыгад). чырвонаармейцаў, камсамолу, дэлегатак і інш., а таксама праз друк, стварыла навакол гэтага пытання грамадзкую думку. Аднак, у ходзе самой праверкі і чысткі апарату гэтая масавасьць і грамадзкая думка ня былі, як належыць, у большасьці мейсц скарыстаны і замацаваны, дзякуючы чаму ў сучасны момант праверка і чыстка апарату праходзіць бяз удзелу рабочых у горадзе.

Прычынамі гэтай слабай масавасьці зьяўляюцца: а) недастатковае практычнае праламленьне прынятых партыяй рашэньняў па выкананьню баявой палітычнай задачы чысткі апарату, як аднэй з форм класавай барацьбы; б) недастатковая арганізацыйная і палітычная падрыхтоўка і ўдзел рабочых з боку парт. ячэек і мясцкомаў—у большасьці бюро і ячэйкі ў цэлым і мясцкомы не зьяўляюцца на справе актыўнымі кіраўнікамі і правадзьнікамі гэтай задачы; в) слабае кіраўніцтва з боку органаў РСІ і г) недастатковы ўдзел у правядзеньні праверкі і чысткі апарату партыйных камітэтаў і прафсаюзаў.

2 Прызнаць, што дырэктывы ЦК і ЦКК—НК РСІ аб праверцы дзейнасьці ўсяго апарату ў сэнсе выкананьня дырэктыў і законаў ажыцьцяўленьня клясавай лініі, выяўленьня хваробных зьявішчаў (бюракратызм, цеганіна, бяздушныя чыноўнічыя адносіны ў абслугоўваньні наведвацеляў) на практыцы не знаходзяць належнага адбітку праводзяцца фармальна:

а) як правіла, у ходзе чысткі ня ставілася пытаньне аб зьмяненьні і палепшаньні сыстэмы работы апарату;

б) не разгорнута шырока самакрытыка ў установах, дзе праводзіцца чыстка апарату, а таксама рабочая крытыка дзейнасьці апарату;

в) не мабілізавана актыўнасьць рабочых вылучэнцаў і ня прыцягнуты да чысткі рабочы актыў устаноў і

г) зусім адсутнічае работа па выяўленьню лепшых прыкладаў работы паасобных устаноў, яго частак, таксама асобных работнікаў з мэтаю скарыстаньня і распаўсюджваньня на другія установы, часткі, заахвочваньня і прасоўваньня паасобных работнікаў.

3. Шырокія рабочыя масы, акрамя выбраных на рабочых сходах амаль што зусім ня ўдзельнічалі ў правядзімай праверцы і чыстцы сав. апарату, пры чым мелі месца і такія выпадкі, калі выбарнасьць брыгадзіраў падмянялася вылучэньнем брыгадзіраў з боку фабкомаў (Віцебск). На рабочых сходах не рабіліся справаздачы аб дзейнасьці правяраемых установаў з садакладамі рабочых брыгад. Сходы па чыстцы з боку рабочых не наведваюцца. Зусім не ўцягнуты гарсаветы і сэкцыі РСІ Гарсаветаў.

4. Прызнаць зусім нездавальняючым выкананьне дырэктыў партыі аб вылучэньстве і падрыхтоўцы замены сав., парт. прафорганамі.

Не ўдзялялася належнай увагі цэнтральным курсам па падрыхтоўцы рабочых вылучэнцаў. Недастатковы якасны падбор курсаў па падрыхтоўцы тэхнічных работнікаў апарату.

5. Вынікі чысткі асабовага складу з прычыны вышэйадзначаных недахопаў у рабоце—прызнаць зусім нездавальняючымі, дзякуючы недапушчальна слабаму выяўленьню бюракратычных элемэнтаў, скажаючых клясавую лінію, не праводзячых дырэктыў партыі і законаў ураду.

Камісіі па чыстцы ў сваёй рабоце не арганізавалі рабочую грамадзкасьць у час чысткі на барацьбу з бюракратычнымі скажэньнямі клясавай лініі.

6. Вывады і прапановы па абгляду, прынятыя камісіяй па чыстцы некаторых устаноў зусім не адбіваюць задач, пастаўленых XVI-й партканфэрэнцыяй па праверцы і чыстцы апарату, абмяжоўваючыся фіксацыяй існуючага разьмеркаваньня абавязкаў паміж супрацоўнікамі з адзначэньнем некаторых тэхнічных недахопаў у працы, пакідаючы і надалей горшыя адмоўныя бакі ў сыстэме работы апарату.

7. Друкуемы ў газэтах матар'ял у большасьці выпадкаў насіў характар агульных разважаньняў навакол чысткі, прычым не ўдзялялася належнай ўвагі закапленьню і асьвятленьню рабкораўскіх матар'ялаў, выяўляючы канкрэтных насіцеляў бюракратызму, цеганіны, скажэньня клясавай лініі і інш. Матар'ялы, зьмяшчаемыя газэтамі ня ўсюды і няпоўнасьцю знаходзяць адбітак у вывадах па абгляду ўстаноў.

Насьцен газэты па большасьці ўстаноў, праходзячых праверку і чыстку, а таксама насьцен газэты ф-к і заводаў не ў дастатковай ступені ўдзялялі ўвагу пытаньням чысткі, як у адносінах выяўленьня недахопаў працы самой установы, так і ў адносінах канкрэтных асоб, дапучаючых тыя альбо інш. парушэньні ў справе ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі і законаў ураду.

8. Праверка і чыстка сав. апарату пачата з устаноў, ня маючых непасрэднай сувязі з шырокімі масамі працоўных (замест НКЗему, НКФіну. органаў працы і органаў суда, пачалі чыстку органаў статыстыкі і крэдытных устаноў), да якіх была меншая зацікаўленасьць з боку шырокай грамадзкасьці.

9. Да гэтага часу чыстка праходзіла без належнай плянавасьці ў працы ў паасобных округах, пры адсутнасьці неабходнай узгодненасьці ў рабоце па чыстцы цэнтральных і акруговых устаноў. Тэмп чысткі па асобных округах вельмі рознастайны (Полацак заканчвае чыстку амаль што па ўсім установам, у той час, як у Мазыры чыстка праведзена толькі па 2-м установам).

10. Савецкія ячэйкі тых устаноў, дзе праводзіцца чыстка, у большасьці выпадкаў не зьяўляліся апорай РСІ; на сходах па чыстцы партыі не выступаюць з крытыкай недахопаў работы апарату у цэлым і паасобных работнікаў; недастатковa рэагуюць на выступленьні паасобных беспартыйных супрацоўнікаў падхаліму, спрабуючых замазаць, альбо скрыць сапраўдныя факты недахопаў у рабоце ўстановы ў цэлым і паасобных работнікаў апарату.

11. З боку раён. камітэтаў партыі і паасобных ячэек прояўляюцца нядбайныя адносіны да вылучэньня рабочых у камісіі па чыстцы апарату, у выніку чаго ў камісіі вылучаліся т.т., зусім не падрыхтаваныя да гэтай справы. Акрамя таго, у сувязі з гэтым мелі месца выпадкі зрыву працы па чыстцы апарату, з прычыны няяўкі рабочых-членаў камісіі на пасяджэньні (НКЗем, НКЮ, БДСтрах, Белкамунбанк).

12. Пры наяўнасьці ў паасобных месцах, дзе была праведзена дастатковая растлумачальная праца, актыўнага ўдзелу ў праверцы і чыстцы апарату з боку батрацтва, бядняцка-серадняцкага сялянства, РВК амаль што зусім ня прымалі актыўнага ўдзелу па ўцягненьні с.-с. батракоў, бядняцка-серадняцкіх мас сялянства па праверцы і чыстцы сав. апарату.

Лічучы неабходным дабіцца ў ходзе чысткі дзяржапарату і барацьбы з бюракратызмам карэннага пералому і забясьпечаньня ў першую чаргу подліннага ўдзелу ў гэтых шырокіх пралетарскіх, батрацкіх, бядняцка-серадняцкіх мас і ўсёй савецкай вёсцы,—Бюро ЦК і Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б пастанаўляюць:

1. Абавязаць АК, АКК-РСІ і Цэнтр. камісію па чыстцы забясьпечыць суадпаведнае інструктаваньне камісій па чыстцы, а ў ходзе чысткі, шляхам сыстэматычнай інспэктуры і праверкі іх работы, дабіцца карэнных зьмен характару чысткі дзяржапарату, сканцэнтраваўшы асноўную ўвагу на вывучэньні і праверцы сыстэмы, мэтадаў і якасьці работы ўстаноў у цэлым і іх частак, у асаблівасьці на дакладным правядзеньні клясавай лініі ў штодзённай рабоце апарату, яго паасобных зьвеньняў і супрацоўнікаў.

2. Абавязаць усіх кіраўнікоў устаноў, усіх членаў партыі прыняць актыўны ўдзел у чыстцы апарату. Органам КК-РСІ ажыцьцяўляць сыстэматычны нагляд і кантроль над выкананьнем гэтай дырэктывы і пры выяўленьні фактаў пасыўнасьці, фармальных адносін, хвасьцізму—неадкладна прымаць рашучыя меры партузьдзейнічаньня на кіраўнікоў устаноў, сакратароў партячэяк і г. д.

3. Лічучы неабходным дабіцца рашучага пералому ў выкананьні гэтай задачы, папярэдзіць пасыўныя адносіны да пытаньня чысткі і барацьбы з бюракратызмам з боку большасьці сав. ячэяк і аддзельных партарганізацый у цэлым—прапанаваць АК і АКК неадкладна абгаварыць пытаньне аб чыстцы сав. апарату і барацьбе з бюракратызмам на сходах партактыву і Пленумах АКК, АК і РК КП(б)Б забясьпечыўшы прапрацоўку гэтае пастановы на ячэйковых партыйных сходах, нарадах сакратароў ячэек, з мэтай прыцягненьня належнай увагі партыйных арганізацый да актыўнага ўдзелу ў правядзімай чыстцы савецкага апарату.

4. У мэтах выяўленьня сапраўднага ўдзелу сав. органаў, партыйных і прафэсыйных арганізацый у чыстцы савецкага апарату, у суадпаведнасьці з пастановамі XVI Партканфэрэнцыі і пастановай Бюро ЦК КП(б)Б ад 8-III—29 г.—даручыць усім Акругкомам КП(б)Б і АКК-РСІ і Цэнтр. камісіі па чыстцы безадкладна правесьці дэталёвую праверку выкананьня дырэктыў партыйнымі і прафэсыйнымі арганізацыямі (ячэйкамі, мясцкомамі, райкомамі, райгрўпкомамі), з мэтай выпраўленьня выяўленых недахопаў, прыцягнуўшы да адказнасьці за невыкананьне гэтых дырэктываў.

5. Адзначаючы зусім слабы ўдзел у правядзеньні чысткі апарату з боку Гарсаветаў,—прапанаваць Акругкомам узмацніць кіраўніцтва фракцыямі Гарсавету ў напрамку актыўнага ўдзелу гарсаветаў, яго сэкцый у рабоце па праверцы і чыстцы апарату.

Абавязаць фракцыі ўсіх РВК і АВК прыняць актыўны ўдзел у праверцы і чыстцы нізавога савецкага апарату, прыцягваючы да гэтай работы сельсаветы, батракоў і бядняцка-серадняцкае сялянства.

6. З мэтай большага прыцягненьня ўвагі пытаньням чысткі з боку прафсаюзных органаў—даручыць Цэнтральнай камісіі па чыстцы дагаварыцца з Прэзыдыумам ЦСПСБ аб пастаноўцы дакладу на Прэзыдыуме ЦСПСБ аб ходзе праверкі і чысткі апарату і ўдзелу прафсаюзаў у правядзеньні гэтай задачы.

7. Адзначаючы зусім слабы ўдзел у працы па чыстцы савецкага апарату з боку камсамолу,—даручыць ЦК ЛКСМБ тэрмінова прыняць усе неабходныя мэропрыемствы, забясьпечваючыя шырокі і актыўны ўдзел камсамолу рабочай і сялянскай моладзі ў чыстцы савецкага апарату, шырока мабілізаваўшы дзеля гэтага атрады „Лёгкай кавалерыі".

8. Улічваючы недастатковы якасны падбор складу камісій па чыстцы, асабліва старшынь,—лічыць неабходным неадкладна пераглядзець увесь склад камісій з мэтай яго ўзмацненьня, дабіўшыся, як правіла, падбору старшынь камісій з членаў ЦКК, ЦК, АКК, АК, мабілізаваўшы ў распараджэньне органаў РСІ на ўвесь час чысткі патрэбную колькасьць работнікаў, асабліва дзеля правядзеньня праверкі і чысткі апарату ў раёнах.

9. Прапанаваць акругкомам КП(б)Б і фракцыям АВК зараз-жа прыняць усе неабходныя меры, забясьпечваючыя выкананьне ўсіх раней даданых дырэктыў ЦКК-РСІ ў адпаведнасьці з пастановай XVI партканфэрэнцыі аб падрыхтоўцы замены вычышчаных.

Адначасова з гэтым даручыць Цэнтральнай камісіі і ўсім АКК-РСІ, фракцыям ЦСПСБ тэрмінова праверыць працу партыйных і прафсаюзных арганізацый у напрамку ажыцьцяўленьня імі дырэктыў па арганізацыі вылучэньства і падрыхтоўкі вылучэнцаў для замены вычышчаемых і арабачэньня апарату наогул.

10. Абавязаць АКК-РСІ, АК і РК узмацніць ролю савецкіх ячэяк і камуністычных у правядзеньні праверкі і чысткі апарату, актыўнага наведваньня праверачных сходаў сваіх устаноў партыйнамі і актыўнага ўдзелу партыйцаў у выяўленьні недахопаў апарату, барацьбе з хваравітымі зьявішчамі, актыўнага рэагаваньня партыйцамі на моманты падхалімства, вакольнай парукі, сакрыцьця недахопаў апарату і асабістага складу з боку беспартыйных работнікаў, адначасова праводзіць рашучую барацьбу з тымі камуністамі, якія прояўляюць хвастызм, замазваньне недахопаў, пасыўнасьць у барацьбе з сямейнасьцю і кругавой парукай.

11. Прапанаваць рэдакцыям цэнтральных і акруговых газэт дабіцца сыстэматычнага асьвятленьня ходу праверкі і чысткі апарату, арганізуючы шырока рабочую масу батракоў, бядняцка-серадняцкую частку сялянства, шырока разгарнуўшы гэтую працу ўнізу, у самых установах, на прадпрыёмствах, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на арганізацыю асьвятленьня прынцыповай вышыні чысткі апарату ў раёнах.

РК і бюро прыняць неадкладныя меры да ажыўленьня работы і ўзмацненьня дзейнасьці рэдкалегій насьценных і шматыражных фабрычных газэт з тым, каб праз іх арганізоўваць і ўцягваць рабочую масу, служачых, батракоў і бядняцка-серадняцкае сялянства да актыўнага ўдзелу і кантролю ў правядзімай чыстцы савецкага апарату.

12. Улічваючы вопыт праведзенай праверкі і чысткі апарату ў раёнах, які паказаў, што без праверкі і чысткі раённага апарату немагчыма дасканала выкрыць і выявіць хваравітыя бакі ў акруговым і цэнтральным апаратах—лічыць неабходным:

а) перанясьненьне цэнтру работы па чыстку райённага апарату з шырокім прыцягненьнем партарганізацый, камсамолу, жэндэлегатак, прафсаюзаў, батракоў і бядняцка-серадняцкіх мас сялянства, узмацніўшы тэмп работы;

б) адначасова правадзіць сыстэматычную падрыхтоўку ў горадзе, канцэнтруючы галоўную ўвагу на ўстановах, дзейнасьць якіх у значнай меры зьвязана з вёскай (НКЗем, НКФін, органы суда і пракуратуры і Белдзяржстрах).

Мабілізаваць асноўную ўвагу рабочых па праверцы і чыстцы апарату органаў НКПрацы, (страхкасы) і кас ашчаднасьці, маючых вялікае значэньне ў абслугоўваньні рабочых і служачых.

13. Праверку і чыстку другой чаргі ўстаноў не пачынаць да канчатковага падвядзеньня вынікаў і падагуленьня вопыту чысткі ўстаноў першай чаргі, у прыватнасьці лічыць неабходным часова ўстрымацца ад правядзеньня чысткі адм-аддзелаў.

14. Абавязаць парт. і праф. арганізацыі забясьпечыць своечасовае вылучэньне актывістых рабочых, батракоў, беднаты і лепшай часткі серадняку у склад камісій па праверцы і чыстцы апарату, актыўны іх удзел у рабоце і справаздачнасьць іх перад рабочымі і сялянамі выбраўшымі іх дзеля гэтай работы.

15. Унесьці большую плянавасьць у работу па чыстцы ў сэнсе ўстанаўленьня пэўнай чарговасьці праверяемых устаноў і прымацаваных да іх рабочых прадпрыёмстваў, арганізоўваючы рабочую грамадзкасьць на чыстцы праверяемай установы.

16. Як пры правядзеньні абгляду праверяемай установы, так і пры чыстцы асабістага складу апарату выяўляць ня толькі адмоўныя моманты ў працы, але і становучыя, з мэтай перанясьненьня апошніх (лепшых вопытаў) у інш. установы, заахвочваць і прасоўваць работнікаў апарату, выяўляючых лепшыя прыклады работы, прояўляючых ініцыятыву ў рацыяналізацыі апарату і г. д.

ПАСТАНОВА ПРЭЗЫДЫУМУ ЦКК.

17. Адзначаючы зусім недапушчальныя адносіны да правядзімай праверкі і чысткі апарату (цэнтрал., акругов. у Менску) з боку ЦП саюзу савгандальслужачых і с.-г. і лясных рабочых, што выразілася ў няпрыняцьці мер па арганізацыі членаў прафсаюзаў на правядзеньне гэтай важнейшай задачы і слабым кіраўніцтве мясцкомамі ў гэтым пытаньні пры адсутнасьці агітацыйна-масавай і палітасьветнай работы ў час правядзеньня праверкі і чысткі апарату (адсутнасьць у клюбах і чырвоных куткох лёзунгаў, плякатаў і інш.), што зьяўляецца грубым невыкананьнем дырэктыў партыі і прафорганаў,—даручыць парткалегіі ЦКК разглядзець пытаньне аб прыцягненьні да партыйнай адказнасьці старшынь ЦП гэтых саюзаў.

18. Улічваючы нядбайныя адносіны з боку бюро ячэйкі шклозаводу „Пралетары" да справы вылучэньня рабочага ў камісію па чыстцы Белкамунбанку, незабясьпечаньне яго яўкі для правядзеньня чысткі апарату Белкамунбанку—даручыць партсьледчаму парткалегіі ЦКК расьсьледваць і выявіць канкрэтных вінаўнікаў у гэтай справе і перадаць АКК для прыцягненьня да адказнасьці.

Адначасова з гэтым даручыць бюро ячэйкі шклозаводу „Пралетары" выявіць прычыны неяўкі на чыстку апарату Белкамунбанку вылучанага ў камісію па чыстцы гэтай установы члена партыі тав Ільясава і прыняць меры ўзьдзейнічаньня.

У САВЕЦЕ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР

На апошнім пасяджэньні Савету Народных Камісараў пад старшынствам тав. Карпа былі разгледжаны наступныя пытаньні:

МЕРАПРЫЕМСТВЫ ДЛЯ ЎЗМАЦНЕНЬНЯ СТАРЫХ САВЕЦКІХ ГАСПАДАРАК.

СНК прыняў пастанову, якою прадугледжваецца шэраг мерапрыёмстваў для ўзмацненьня савецкіх гаспадарак БССР. Катэгарычна забараняецца зямельным органам рабіць абрэзку зямельнай плошчы савгасаў, у якой бы ня было форме і неадкладна прыступіць да ўзбуйненьня іх праз перадачу ім сумежных плошчаў дзяржаўнага запаснага земфонду, праз аб'яднаньне сумежных савгасаў у адну зямельную тэрыторыю, а таксама праз далучэньне да савгасаў сумежных сялянскіх зямель у выпадку згоды землякарыстальнікаў на перасяленьне ў іншыя райёны БССР або СССР. Узмацненьне савецкіх гаспадарак павінна праводзіцца на грунце разьвіцьця ў іх сельска-гаспадарчай індустрыі, для чаго на працягу бліжэйшых гадоў пры савгасах павінны быць утвораны тэхнічна-заводзкія прадпрыемствы па пераапрацоўцы сельска-гаспадарчага сырцу. Гэтыя прадпрыемствы павінны быць разьлічаны ня толькі на пераапрацоўку ўласнага сырцу савгасаў, але і сырцу вакольнага насельніцтва. Будаўніцтва тэхнічна-заводзкіх прадпрыемстваў павінна быць зьвязана з электрыфікацыяй савгасаў і вакольных насельных пунктаў.

З мэтаю разьвіцьця малочнай прамысловасьці савгасаў устанаўляецца такі парадак, што арганізацыі і паасобныя сялянскія гаспадаркі, якія дастаўляюць у савгасы на пераапрацоўку малочныя прадукты, павінны забясьпечваць моцнымі кармамі на адноль кавых умовах з насельніцтвам, якое здае малако ў каапэрацыю.

Пры трактарызацыі савгасаў пастаноўлена арганізаваць з 1929 г. ня менш 10 трактарных калён, якія навінны абслугоўваць побач з савгасамі і калгасы, а таксама і сялянскія гаспадаркі.

Маючы на ўвазе, што ўзмацненьне старых савецкіх гаспадарак ва ўмовах БССР у значнай меры залежыць ад разьвіцьця прадукцыйнай малочнай жывёлагадоўлі, СНК пастанавіў павялічыць колькасьць статку буйнай рагатай жывёлы да канца 1929-30 г. да 15.000 кароў і закупіць праз кантрактацыю да 1932-33 г. 1.000 галоў маладняку, перайсьці да арганізацыі буйных малочных фэрм з утрыманьнем у аднэй гаспадарцы да 1000 галоў дойных кароў, з арганізацыяй мэханізаваных масларобных заводаў і г. д.

Гародную плошчу савгасаў, якія знаходзяцца блізка гарадоў і рабочых цэнтраў, пастаўлена давесьці да 1932-33 г. ня менш да 1000 гэктараў, надаўшы ў далейшым арганізацыі гародніцтва прамысловы напрамак.

Для дасягненьня найлепшых вынікаў працы савгасаў шырока практыкаваць мэтад сацыялістычнага спаборніцтва, а таксама ўжыць захады да стварэньня сталага кадру рабочых, да падвышэньня іх кваліфікацыі. СНК прызнаў таксама неабходным урэгуляваць жылішчнае пытаньне савгасаў, забясьпечыўшы рабочых у самы бліжэйшы час кватэрамі. Белсельтрэст разам з ЦП саюзу с.-г. і лясных рабочых павінен распрацаваць сыстэму мерапрыемстваў па ліквідацыі цякучасьці адміністрацыйнага пэрсаналу савгасаў, па ўкамплектаваньню іх вопытнымі і кваліфікаванымі кіруючымі кадрамі і г. д.

МЕРАПРЫЕМСТВЫ ДЛЯ ПАЛЕПШАНЬНЯ СПРАВЫ САЦЫЯЛЬНАГА ЗАБЯСЬПЕЧАНЬНЯ.

СНК прыняў пастанову па дакладу Народнага Камісара Сацыяльнага Забясьпечаньня тав. Масальскага аб становішчы сацыяльнага забясьпечаньня ў БССР. СНК адзначыў, што да гэтага часу акруговыя і раённыя выканаўчыя камітэты і гарадзкія саветы мала зрабілі для выкананьня пастаноў СНК у галіне палепшаньня справы сацыяльнага забясьпечаньня. У гэтай галіне ёсьць яшчэ шэраг недахопаў: няма сталага падліку былых чырвоных партызан і іх сем'яў, адсутнічае падлік асоб, маючых права на дзяржаўнае забясьпечаньне, ёсьць выпадкі цяганіны пры афармленьні пэнсійных спраў, мала ўвагі ўдзяляецца палепшаньню становішча інвалідных дамоў і г. д.

Каб палепшыць у далейшым справу сацыяльнага забясьпечаньня СНК пастанавіў ускласьці адказнасьць у райвыканкомах і гарсаветах за пастаноўку справы сацыяльнага забясьпечаньня на аднаго з членаў прэзыдыуму райвыканкому або гарсавету, аслабаніўшы ад гэтай працы старшынь раённых камітэтаў узаемадапамогі; інспэктары сацыяльнага забясьпечаньня павінны быць аслабанены ад абслугоўваньня гарадзкога кантынгенту і ад іншых работ, не зьвязаных з іх абавязкамі. НК Сацыяльнага Забясьпечаньня павінен паскорыць абгаварэньне праэкту палажэньня аб самастрахаваньні жанчын-сялянак бяднячак на выпадак цяжарнасьці і распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па барацьбе з жабрацтвам і бяспрытульнасьцю, а таксама распрацаваць мерапрыемствы па правядзеньню праверкі і чысткі асоб, якія карыстаюцца сацыяльным забясьпечаньнем і не дапушчаць у далейшым выдачу пэнсій сацыяльна-чужым элемэнтам. III. раг мерапрыемстваў прадугледжваецца правесьці для ўзмацненьня працы, як камітэтаў сялянскай узаемадапамогі, так і гарадзкіх і местачковых камітэтаў узаемадапамогі.

ПРА СТРАХАВАНЬНЕ РАБОТНІКАЎ ЛЯСЬНІЦТВАЎ.

СНК пастанавіў правесьці з пачатку 1929-30 бюджэтнага году абавязкова дзяржаўнае страхаваньне лясьнікоў і абъездчыкаў на выпадак раптоўнае сьмерці калецтва ў сувязі з выкананьнем імі службовых абавязкаў. У каштарысе НК Земляробства ўстанаўляецца выдача аднаразовых дапамог усім лясным працаўнікам, якія мелі матар'яльную страту ад падпалу, рабаваньня і іншых гвалтоўных дзеяньняў у сувязі з выкананьнем імі службовых абавязкаў. Разьмер аднаразовых дапамог у кожным паасобным разе вызначаецца НКЗ разам з ЦП саюзу с.-г. і лясных рабочых.

ВОДПУСК ТАВ. КАЛНІНУ.

СНК прадаставіў Народнаму Камісару Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі т. Калніну 2-хтыднёвы водпуск з 10 жніўня г. г.

ДА УЗЬНЯЦЬЦЯ УРАДЖАЙНАСЬЦІ

У Беларусі адзначан шэраг недахопаў.

(Ад нашага маскоўскага карэспандэнта).

Зараз у цэнтральных органах у Маскве прапрацоўваецца пытаньне аб выніках праверкі выкананьня пастановы 4-й сэсіі ЦВК СССР 4-га скліку аб захадах да падняцьця ўраджайнасьці і аб выніках правядзеньня веснавой пасеўнай кампаніі.

У аўтарытэтных колах вашаму карэспандэнту па гэтай прычыне паведамілі наступнае:

— Пастанова сэсіі бязумоўна выклікала рашучы зрух у дзейнасьці ўсіх савецкіх органаў, абслугоўваючых сельскую гаспадарку, і ўзмацніла іх працу па ўзьняцьці на мясцох сельскае гаспадаркі. Ёсьць таксама зрухі ў сялянстве ў бок шырокага ўжываньня простых агрыкультурных мерапрыемстваў і ўздыму сельскае гаспадаркі і калектывізацыі.

Аднак, разам з гэтым зазначаецца наліча шэрагу недахопаў.

Далёка ня зусім, напрыклад, былі ў веснавую пасеўную кампанію выкарыстаны ўсе матар'яльныя сродкі і магчымасьці дзеля пасьпяховай барацьбы за ўраджай. Выявілася таксама слабасьць і нездавальняючае кіраўніцтва зямельнымі органамі на мясцох усёй складанай працай па тэхнічнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі.

Асабліва зьвяртае на сябе ўвагу недастатковае разгортваньне прац па гатунковаму семнаводзтву і па падрыхтоўцы да замены простага насеньня гатунковым у тэрміны паказаныя ўрадам. Дырэктыва сэсіі ЦВК па гэтаму пытаньню застала ўсе ўрады саюзных рэспублік да гэтай справы непадрыхтаванымі. Да гэтага часу няма яшчэ канчаткова прапрацаваных і ўвязаных з месцамі 5-цігадовых плянаў па разьвіцьці семнаводчаскай працы, а ў шэрагу рэспублік (Беларусь) недастаткова распрацавана пытаньне і аб дзяржаўным гатунковым фонде. Яго арганізацыю толькі зараз распачынаюць.

Наглядаецца значная недазагатоўка гатунковага насеньня і разьмяркоўваньне іх па спажывецкія патрэбы. На Урале напрыклад, загатоўка гатунковага насеньня хістаецца ў межах 35—50 проц. ад валавага збору—істотных станоўчых зьмен тут пакуль не адзначаецца.

Завоз у шэраг раёнаў Дальнеўсходняга краю насеньня надзвычайна нізкай якасьці выклікаў вялікія непаразуменьні на мясцох і ўтварыў пагрозу невыкананьня заданьняў па пашырэньні пасеўнай плошчы.

У адных і тых-жа райёнах нагрузка на адзін трыер хістаецца ад 6.000 да 9.000 пудоў, а на сартыроўку ад 4.000 да 1.800 пудоў. Амаль усе мясцовыя РСІ адзначаюць, што нават пры наяўнай колькасьці насеньня-ачышчальных машын і пры нагрузцы іх на 75-80 проц. ад нармальнай, усё пасеўнае збожжа можа быць без асобных цяжкасьцяй ачышчана.

На Урале аказалася вельмі мала падыходзячых дзеля мясцовых вытворчых умоваў машын і прылад, асабліва неабходных дзеля аказаньня практычнай дапамогі бяднацкай часткі сялянскіх гаспадарак.

У Беларусі шэраг машын у практычных пунктах ня быў выкарыстаны.

Ремонт сельска-гаспадарчага інвэнтару да гэтага часу зьяўляецца нездавальняючым. На Урале кошт усяго зробленага да вясны рамонту сельска-гаспадарчых машын у сярэднім ад 300-600 рублёў на майстэрню, а колькасьць адрамантаванага інвэнтару вылічалася некалькімі дзесяткамі адзінак.

Выкананьне дырэктыў Ураду аб пашырэньні аграсеткі ідзе слаба. Прэміраваньне агра-працаўнікоў нідзе на мясцох ня ўжываецца. Зарплата іх як і раней нізкая.

Трэба дзеля гэтага—як нам заявілі—надаць найбольшую канкрэтнасьць усім выглядам масавай грамадзкай агра-культурнай працы ў вёсцы па ўзьняцьці ўраджайнасьці ў адпаведнасьці з мясцовымі ўмовамі і прыцягнуць да гэтага сапраўды шырокія сялянскія масы.

У бліжэйшыя часы калегія Наркамату РСІ СССР заслухае і абгаворыць вынікі праверкі выкананьня 4-й сэсіі ЦВК СССР аб захадах па ўзьняцьці ўраджайнасьці.

Мік. Ан—скі.

Масква, 13-га жніўня 1929 г.

ЭКАНАМІЧНЫ І КУЛЬТУРНЫ РОСТ БССР

(Ад нашага маскоўскага карэспандэнта).

Аб карыстаньні сялянамі с.-г. машын.

Упраўленьне прамтавараў пры Наркамгандлю СССР дало наступнае растлумачэньне сталаму прадстаўніку Беларускай ССР у Маскве пры Ураду СССР:

— Забарона здачы ў наём атрыманай у крэдыт сельска-гаспадарчай машыны да поўнай уплаты прадаўцу ўсёй сумы не супярэчыць урадавым дырэктывам аб максымальным выкарыстаньні сельска-гаспадарчых машын.

Аднаасабовая сялянская гаспадарка ў тым выпадку, калі яна ня здолее даць поўнай нагрузкі сельска-гаспадарчай машыны ў сваёй гаспадарцы, мае поўную магчымасьць выкарыстаць гэту машыну ў розных першаістых сялянскіх аб'яднаньнях пачынаючы з простых формаў, як-та: супрага, таварыства па супольнай апрацоўцы зямлі і інш.

Абслугоўваньне культурных патрэбаў беларусоў ў Маскве.

Як вядома, у Маскве налічваецца ў сучасны момант каля 27.000 беларусоў-працоўных. Нядаўна УсеЦВК прапанаваў Массавету ў мэтах лепшага абслугоўваньня культурна-асьветных патрэбаў працоўных беларусоў у Маскве, забясьпечыць Цэнтральны клюб беларусоў на зіму ўпоўне лагодным памяшканьнем для разгортваньня там зімовай палітыка-асьветнай і культурна-клюбнай працы.

Прапрацоўка кантрольных лічбаў БССР на 29-30 г.

Зараз у Маскве ў шэрагу цэнтральных ведамстваў і ўстаноў (НК Земляробства, Наркамгандль СССР і Дзяржплян і інш.) ідзе ўзмацнёная прапрацоўка кантрольных лічбаў Беларускай ССР на 1929-30 г. па сельска-гаспадарчым машынам, сродкам барацьбы і г. д. Найбольш вузкім месцам зьяўляецца некаторае зьніжэньне заяўкі БССР на трыеры і складныя малацілкі. Канчатковая сьцьвярджэньне кантрольных лічбаў БССР на 1929-30 г. адбудзецца на адным з бліжэйшых пасяджэньняў Савету Працы і Абароны.

Аб льготным тарыфе на перавозку вапны ў БССР.

У цэнтры ўзьнята пытаньне аб зьніжэньні для БССР тарыфу на перавозку вапны ў прадстаючую асеньнюю пасеўную кампанію. У бліжэйшай будучыне чакаецца рашэньне Савету Працы і Абароны па гэтаму пытаньню.

Трактары для Беларусі.

Перад цэнтральнымі органамі зараз узьнята пытаньне аб вызначэньні для БССР у бягучым годзе 92 трактары, згадна пляну асеньняй пасеўкампаніі па БССР.

Прадстаўнікі БССР ў Маскве, акрамя гэтага хадайнічаюць перад цэнтрам аб вызначэньні для БССР 495 трактараў пры разьмеркаваньні апошніх па рэспублікам. З гэтай колькасьці трактараў 394 трактары намечаюцца для арганізацыі 55 трактарных калён.

Колькі трэба кваліфікаванай рабсілы для БССР?

Дзяржплян СССР паведаміў Савнаркам СССР, что ён вызначае наступную патрэбу новых і рэканструіруемых прадпрыёмстваў прамыславасьці ў кваліфікаванай рабсіле за 1929-30 г.—32-33 г. па Беларусі: агульная колькасьць уцягваемых рабочых вызначаецца ў ліку 23.150 чалавек, з іх кваліфікаваных рабочых—12.480 чалавек, што складае 4,0 проц. да ўсяго ліку ўцягваемых у СССР рабочых. Гэта лічба складаецца з 3430 рабочых высокай кваліфікацыі і 9050 рабочых масавай кваліфікацыі.

Мінэральныя ўгнаеньні для БССР.

У сучасны момант у цэнтры, пры распрацоўцы кантрольных лічбаў БССР на 1929-30 г. па сельскай гаспадарцы, намечаецца наступны плян разьмяркаваньня мінэральных угнаеньняў па сэктарам (савгасы, калгасы, аднаасобнікі) у тысячах тонах; супэрфасфату—30,5; фасфарытнай мукі—45: сульфат-амоніі—3; калійнай солі 15 проц.—10 і томас-шлаку—4. Агульная жа колькасьць мінэральных угнаеньняў для БССР у 1929-30 г. вызначана ў 92,0 тыс. тон, што дае суму ў 213,5 тыс. р.

Агітацыйная паездка па Лянкашырскай акрузе.

У працягу апошніх двух тыдняў па даручэньню партыі я правоўзіў кампанію супроць небясьпекі імпэрыялістычнай вайны ў Лянкашырскай акрузе. Гэта округа асабліва цікава, бо з прычыны тэкстыльнага крызісу,—тут пануе вялікае беспрацоўе сярод усіх разрадаў рабочых. Тут таксама інтэнсыўна ажыцьцяўляецца рацыяналізацыя вытворчасьці.

У назначаны дзень я зьявіўся на мітынг да фабрычных будынкаў. Фабрыка знаходзілася на поў-дарозе ад Манчэстэра да Альдгэму. Даволі вялікая фабрыка і параўнаўча новая. На ёй працуе некалькі тысяч рабочых. Тутака-ж блізка знаходзяцца іх дамы.

Мясцовыя партыйныя таварышы вырашылі, што мітынг лепш усяго правесьці ля будынкаў фабрыкі. Абвяшчэньне аб мітынгу было напісана крэйдаю на бруку. Нехта з фабрычнай адміністрацыі загадаў, каб яго сьцёрлі.

Мы пачалі з раздачы лістовак. На парогах дамоў зьявіліся жанчыны. Некаторыя з іх, прачытаўшы словы „Камуністычная партыя" разгневаліся і пачалі моцна лаяцца. Іншыя, быццам зацікавіліся. Рабочыя трымаліся здалёку ад вышкі, з якой гаварыў прамоўца. Прыблізна чалавек 80 слухала яго ў працягу дваццаці хвілін, покуль гудок не абвясьціў час звароту на фабрыку. Яны ня выявілі адчыненай варожасьці, хутчэй была пэўная доля індыфэрэнтнасьці. І ўсе рабочыя ведалі, што з вакон канторы за імі наглядае кіраўнік.

Наступны мітынг мы арганізавалі ў той-жа акрузе на біржы працы для беспрацоўных рабочых, якія зьявіліся сюды для рэгістрацыі. Тут таксама рабочыя трымаюцца ад нас здалёку. Яны баяцца, што загадчык бірж

ПЕРАД НОВЫМ НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДАМ.

Заўвагі да новага навучальнага году.

Шмат увагі аддавалася і зараз аддаецца камуністычнаму выхаванню нашае моладзі ў школах. Пад гэтым мы разумеем інтэрнацыянальна-клясавае, антырэлігійнае, калектывістычнае і працоўнае выхаваньне тых, хто павінен стаць нам на зьмену, хто будзе ў далейшым ажыцьцяўляць заветы найвялікшага настаўніка Ул. І. Леніна.

З гэтай мэтай партыя, улада і прафсаюзы ўвесь час імкнуліся да таго, каб уцягнуць у працу школ шырокія колы рабочых і наогул працоўнага насельніцтва. Навакол працы школ і культасьветных установ гуртавалася грамадзкая думка, праз якую высьвятлялися як дасягненьні ў жыцьці і працы гэтае галіны, так і тыя хібы, якія патрэбна было тут выпраўляць або зьнішчаць.

За апошнія часы ў гэтым напрамку назіраецца значны зрух у добры бок: ёсьць значныя дасягненьні, праведзена надзвычайна вялікая грамадзка-карысная праца школамі сярод насельніцтва, якое пачало сапраўды цікавіцца жыцьцём і працаю школы і дапамагаць ёй як маральна, так і матар'яльна.

У паасобных выпадках у гэтай галіне ёсьць надзвычайныя плюсы, але часам сустракаюцца ня меншыя і мінусы. Вось на гэтыя мінусы і патрэбна зьвярнуць належную ўвагу ў пачатку навучальнага году з тым, каб за наступны навучальны год калі не пазбавіцца ад іх раз назаўсёды, дык прынамсі хоць зьвесьці іх да мінімуму.

Возьмем галіну інтэрнацыянальнага клясавага выхаваньня некаторай часткі менскіх школ. Па гэтаму пытаньню пісалі, дакладвалі і гаварылі шмат, і здаецца, што тут ужо ўсё ўпарадку. Але на справе аказваецца далёка ня так. У аднэй з школ гораду «праваслаўныя» камсамольцы далі ў «косьці» яўрэю, які зьявіўся ў школу на антырэлігійны вечар, прысьвечаны яўрэйскай пасцы, і замест таго, каб, згодна яго дамаганьням, адвесьці яго да загадчыка школы, пры дапамозе тэхпрацаўніка справадзілі яго ў уборную, ды і зачынілі там. Характэрны момант назіраўся там-жа перад 1 мая. У шостай клясе вывешваецца плякат з надпісам: «Далоў перны май, няхай жыве св. Пасха!» А ў самы дзень вялікадня „хрыстосуюцца" настаўнік з тэхпрацаўніком, а загадчык—з камендантам. Аб гэтым было напісана ў насьценгазэце Дому Асьветы. Пералічваць тое, аб чым пісалася ўжо ў газэтах і на што нават зварачалася ўвага сэкцыі Нарасьветы гарсавету, ня варта, хоць ёсьць яшчэ шмат такога, аб чым мо' і патрэбна было-б пагаварыць, бо ўсё гэта разам узятае сьведчыць аб тым, што справа выхаваньня далёка не на належнай вышыні, і на гэта, асабліва ў пачатку новага навучальнага году патрэбна зьвярнуць увагу і даць разумнае кіраўніцтва.

Сустракаюцца загадчыкі школ, якія лаюць тэхпрацаўніка за тое, што той у пасьлявабеденны час прыходзе ў кватэру да загадчыка з запытаньнем; ёсьць асобы недастаткова аўтарытэтныя сярод вучняў і настаўніцтва таму, што ня могуць паставіць сябе, як след, ня зусім добра разумеюць сваю ролю і месца ў школе, а таксама і прызначэньне паасобных працаўнікоў. Зразумела, што ад гэтага парушаецца нармальнае жыцьцё школы, правільнае камуністычна-клясавае выхаваньне моладзі, за што, апрача педагагічнай рады школы, адказнасьць нясуць загадчык установы, грамадазнаўца, фарпост і настаўніцтва.

Нельга забывацца і пра інспэктуру, якая са школаю праводзіць пераважна напяровую сувязь, а ня жывое кіраўніцтва і інструктаж.

Пра ўсё гэта ня шкодна напомніць у пачатку новага навучальнага году з такім разьлікам, каб у далейшым не сустракацца з рознымі ганебнымі выпадкамі, каб школа сапраўды выхоўвала актыўных змагароў-ленінцаў за справу працоўных.

S.

Навучальны год сустракаем падрыхтаванымі.

Наркамасьветы даў дырэктывы, каб падрыхтоўка да новага навучальнага году па школах сацвыху распачалася з 15 жніўня.

З 25 жніўня ў школах сямігодках і чатырохгодках гарадоў і райённых цэнтраў пачынаюцца заняткі, а ў вясковых пачатковых школах заняткі павінны пачацца з 1 верасьня і як выключэньне ні ў якім разе не пазьней 15 верасьня.

Напярэдадні новага навучальнага году як у гарадох, так і па райёнах будуць праведзены вытворчыя настаўніцкія канфэрэнцыі. На канфэрэнцыях паміж іншымі пытаньнямі будуць абгавораны: плянаваньне і вучот працы, а таксама вынікі дапамогі беднаце ў мінулым годзе і пэрспэктывы ў гэтай галіне ў надыходзячым навучальным годзе.

Настаўніцтву неабходна будзе разгарнуць шырокую кампанію па ўцягненьню ў школы дзяцей рабочых, батракоў, калгасьнікаў і сялянскай беднаты.

Сёлета паводле 5-хгадоваму пляну па мясцоваму бюджэту мяркуецца значна павялічыць водпуск сродкаў на аказаньне дапамогі дзецям беднаты. У каштарысы ўносяцца на гэту справу сродкі з разьліку па 1 руб. на кожнага вучня школы.

Для бяднейшых вучняў другога канцэнтру райённых і вясковых сямігодак вызначана 100.000 руб. па стыпэндыі ў разьмеры 25 руб. кожная. Стыпэндыі не павінны драбіцца, выдаткоўвацца цалкам на вопратку, абутак і часткова на харчаваньне ў інтэрнатах.

Наркамасьветы даў на месцы ўказаньні, каб школьныя фонды беднаты, якія складаюцца з бюджэтных асыгнаваньняў і са сродкаў грамадзкіх арганізацый, поўнасьцю скарыстоўваліся на 100 процантнае забясьпечаньне дзяцей батракоў і беднаты.

Значна дапаможа сялянскай беднаце і тое, што з наступнага году пры сямігодках адчыняецца яшчэ 51 інтэрнат, якіх па ўсёй БССР будзе існаваць 178.

Бездзяржвыдавецтва па дагаворах з акругамі забясьпечвае школы падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі. Да новага навучальнага году выдадзена шэраг падручнікаў: чытанка для III і IV гадоў навучаньня і для II канцэнтру падручнікі па грамадазнаўству, прыродазнаўству і рабочая кніжка па матэматыцы. Складзены зусім новыя праграмы для пачатковых школ і першага канцэнтру сямігодак, а таксама і для другога канцэнтру. У новых праграмах яскрава адбіваюцца пытаньні сельскай гаспадаркі, інтэрнацыянальнага і антырэлігійнага выхаваньня, элементы ваенізацыі.

З наступнага году сетка пачатковых школ пашыраецца на 1335 камплектаў і на 85 камп. пашыраецца другі канцэнтр сямігодак. Такім чынам у наступным годзе нашы школы сацвыху ахопяць на 60.000 дзяцей больш, чым летась. Пачатковыя школы будуць цалкам забясьпечаны настаўнікамі, некаторы недахоп будзе адчувацца ў настаўніках II канцэнтру.

В. З.

Польская школа сялянскай моладзі.

У гэтым навучальным годзе ў Валынецкім райёне адчыняецца польская школа сялянскай моладзі, разлічаная на 40 асоб. Школа дасьць поўную мажлівасьць працоўным палякам палепшаць сваю гаспадарку праз набытыя веды.

(Полаччына). С. М.

Задача асьветніка ў перавыбарах саюзных органаў.

Саюзныя органы працаўнікоў асьветы ўжо прыступілі да падрыхтоўчай працы па правядзеньню перавыбараў. Год таму назад асьветніцкая маса выбрала свае кіруючыя прафсаюзныя органы, якім і даручыла весьці працу пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі. Яна вылучыла і паставіла перад імі цэлы шэраг канкрэтных заданьняў. Цяпер саюзная маса і павінна запытаць у сваіх выбарных таварышоў, як яны выканалі заданьні масы, як яны сваею працаю дапамагалі больш пасьпяховаму разьвіцьцю соцыялістычнага будаўніцтва, як яны дапамагалі падняцьцю вытворчасьці ўстаноў, наладжаньню працоўнай дысцыпліны, абаранялі прававое і матар'яльнае становішча асьветнікаў, як яны вялі працу па падняцьцю палітычнай і прафэсыйнай сьвядомасьці асьветнікаў, які іх удзел па ўцягненьню асьветнікаў у правядзеньні палітычных і гаспадарчых кампаній, па наладжаньню і ўцягненьню асьветнікаў у грамадзка-карысную працу і г. д. Вось цэлы шэраг асноўных пытаньняў, якія павінна асьветніцкая маса паставіць перад сваімі выбарнымі таварышамі—патрабаваць на іх адказу.

Перажываемы намі пэрыяд узмоцненага тэмпу сацыялістычнага будаўніцтва, рашучы наступ элемэнтаў сацыялістычных на элементы капіталістычныя выклікалі асаблівую актыўнасьць варожых элемэнтаў—непмана, кулака, спэкулянта—супроць мерапрыёмстваў партыі, Савецкае Ўлады як у горадзе, так і ў вёсцы.

Клясавая барацьба нанесла свой адбітак і сярод асьветніцкай масы.

Праведзеныя кампаніі ў гэтым годзе, як перавыбары саветаў, падпіска на дзяржаўныя пазыкі, двухтыднёвік Касы Ашчаднасьці, вясеньняя пасеўная кампанія, ліквідацыя няпісьменнасьці і г. д. —яскрава паказалі ролю і месца асьветніка. Яны паказалі, што асноўная маса асьветнікаў сваю працу праводзіць пад лёзунгам выкананьня дырэктыў і настаноў Камуністычнае партыі і Савецкае Ўлады. Але-ж правядзеньне гэтых кампаній выявіла і другое, што некаторыя асьветнікі, якія яшчэ да гэтага часу трымаліся п а с ы ў н а, пачалі дыферэнцыравацца; адны з іх рашуча перайшлі на бок асноўнай масы асьветнікаў, асьветнікаў савецкі настроеных, і працуюць пад кіраўніцтвам партыі, а аказаліся і такія, якія свой жёс зьвязалі з варожымі нам элемэнтамі, сваю працу сталі праводзіць на шкоду інтарэсам партыі і ўлады, на шкоду інтарэсам рабочае клясы, на шкоду ўсіх працоўных. Прыкрыя зьявішчы як у жыцьці паасобных калектываў асьветнікаў, так і ў іх працы і працы цэлых установ—антысэмітызм, шавінізм розных колераў, рэлігійнасьць, несваечасовае рэагаваньне на гэтыя хібы, прымірэнчыя адносіны да усяго гэтага—усё гэта яшчэ ў некаторых выпадках мела месца. Значная частка гэтых хібаў тлумачыцца тым, што саюзныя органы слаба наладзілі выхаваўчую працу сярод асьветнікаў. Яны часта не маглі сваечасова ўлавіць і вывяўць гэтыя хібы. Былі выпадкі, што саюзныя органы замест таго, каб сваечасова прысьці на дапамогу асьветнікаў, які мыляўся ў сваей працы, стаялі з боку ў ролі пабочнага гледача і толькі зьяўляліся на шапачны разбор, калі ўжо каля таго ці іншага прыкрага выпадку завострывалася ўвага ўсёй савецкай грамадзкасьці.

Правільная і сваечасовая пастаноўка выхаваўчай работы сярод асьветнікаў значна дапамагла-б зьнішчэньню розных хібаў у працы культурна-асьветных установ і паасобных асьветнікаў.

Вось чаму як саюзным органам, так і ўсёй асьветніцкай масе неабходна гэтай перавыбарчай кампаніі сваіх органаў аддаць асаблівую ўвагу. Пытаньне крытыкі і самакрытыкі пры абгаварэньні пастаноўкі ў нас саюзнай работы павінна знайсьці самае шырокае месца. Уся работа саюзных органаў павінна быць узята пад самы шырокі кантроль саюзнай масы. Неабходна зараз-жа на нарадах прафдэлегатаў, на пасяджэньнях саюзных органаў вылучыць камісіі, якія заняліся-б праверкаю, як саюзныя органы выконвалі дырэктывы і пастановы вышэйшых саюзных органаў, як яны выконвалі і праводзілі ў жыцьцё і свае пастановы, пастановы нарад, агульных асьветніцкіх сходаў і г. д.

Дзеля лепшага правядзеньня перавыбарчай кампаніі, дзеля большага наведваньня асьветнікамі справаздачных і перавыбарчых сходаў неабходна зьвярнуць увагу і на тэхнічны бок. Сваечасовае паведамленьне сяброў саюзу аб месцы перавыбарчых сходаў, парадку дню, падрыхтоўка кватэр і г. д., усё гэта павінна быць сваечасова прадугледжана і належным чынам упарадкавана. Кожны саюзны орган павінен паставіць перад сабою заданьне—100 процантная яўка сяброў саюзу на перавыбарчыя сходы.

Таксама пры правядзеньні перавыбарчай кампаніі неабходна значную ўвагу аддаць падбору актыўных, працаздольных і аўтарытэтных таварышоў у склад кіруючых саюзных органаў, якія маглі-б з посьпехам праводзіць сваю працу пад кіраўніцтвам партыі.

Уся праца як па падрыхтоўцы да перавыбараў, так і перавыбары і наогул уся праца саюзных органаў і ўсёй асьветніцкай масы як з дадатных, так і адмоўных бакоў павінна знайсьці самае шырокае асьвятленьне ў пэрыядычным друку і насьценгазэтах.

Вось асноўныя моманты, на якія і саюзным органам і ўсёй асьветніцкай масе трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу пры правядзеньні перавыбарчай кампаніі.

Ц. Мельнік.

План ліквідацыі няпісьменнасьці выканаем.

(Шклоўскі р., Магілёўшчына).

У мінулым навучальным годзе па Шклоўскім райёне было ахоплена ліквупунктамі і школамі мелапісьменных паўтары тысячы чалавек. У наступным годзе мяркуецца ахапіць няпісьменных звыш 2 з пал. тысяч.

Райпалітасьвет ужо правёў падрыхтоўчую працу па ўсім райёне. Складзен план ліквідацыі няпісьменнасьці, вызначана дзе будзе ліквупункт або школа малапісьменных.

Ліквідацыя няпісьменнасьці будзе праводзіцца праз групавое і індывідуальнае навучаньне. Для гэтага будуць скарыстаны настаўнікі, камсамольцы, партыйцы, скончыўшыя 7-годкі, а таксама пісьменны актыў вёскі.

Для больш рацыянальнага скарыстоўваньня сродкаў мяркуецца па райёне правесьці толькі групавое і індывідуальнае навучаньне, скараціўшы ўсе гадавыя стаўкі як школ малапісьменных, так і ліквупунктаў, якія былі ў мінулым годзе. У групах павінна быць толькі 35 вучняў з працягам навучальнага году 5-6 м. Чым дзёны гадавыя стаўкі? Для прыкладу возьмем школу малапісьменных. Ліквідатару аплачваецца 48 руб. у м-ц, што ў год складае 576 руб. Гэта школа навучае 25-30 вучняў, у сярэднім на кожнага вучня траціцца 20-25 руб. у год, а пры групавым навучаньні ён абыйдзецца на палову таньней.

У тых вёсках, дзе ліквупункт знаходзіцца пры школе, кіраваць і весьці працу будзе настаўнік, якому аплачваецца 50 проц. яго пэнсіі па школе г. зн. 25 руб. у месяц. Пытаньне гэта ўжо абгаварвалася на сходзе ўпаўважаных саюзу працасьветы.

Мэтадычнае кіраўніцтва будзе ісьці праз апорны ліквупункт і настаўніцкія аб'яднаньні (апорныя школы), на якіх будзе нарыядычна ставіцца пытаньне аб ліквідацыі няпісьменнасьці.

Р. Х.

Жыцьцё і праца калгасаў.

І навошта куплялі?

(Прыклад калгаснага галавацяпства).

Нарашыла беднота Плёсаў (пасёлак пад Гомелем) павялічыць ураджайнасьць сваіх палёў, забясьпечыць сябе хлебам на ўвесь год, ды і дзяржаве дапамагчы.

Парашылі-зрабілі. Збудавалі невялічкае (10 гаспадарак) машыннае таварыства, крэдытор-жа гомельскіх калгасьнікаў «Пахарь» 200 руб. адваліў і плёсаўцы—з сеялкай, лугавой бараной і нават з саломарэзкай.

Набліжаўся вясеньні сеў. Сяляне рыхтавалі поле, а сеялка-ж не гатова: як прывезьлі часткамі, так і ляжыць не сабранай. Самі скласьці ня ўмеюць, а аграном нешта ня едзе, ды і не пасылалі яшчэ за ім. Напіраюць сяляне на старшыню т-ва:—«давай машыну, поле гатова». А той усё нешта чакае і толькі ў самы дзень севу паслаў за аграномам.

А калі-ж сеялку складвалі (тут ужо не дачакаўся!) першым засеяў уручную, з кошыка: падаў сялянам прыклад „культурнага" гаспадараньня... І праз дзень—сяляне адсеяліся. Бліскучая-ж новая сеялка было ўсьміхнулася жоўтымі літарамі „Укрсельмаштрэст", але скора патускнела: суровы «гаспадар», „машынны" старшыня, маючы на чым сьвет стаіць цяжкую машыну, завалок яе ў хлеў па «гаспадараньне» сьвіней ды кароў. Тыя трохі «пачарнілі» яе і ня стала ўжо відаць жоўтага „Укрсельмаштрэст", мабыць ганарлівы трэст не захацеў сьвінячага суседзтва...

— Ну, сеялка, гэта што...—мармытаў сабе пад нос „гаспадар" старшыня,—у нас яшчэ барана... вось яна выручыць, як забаронім...

Так, «забараніў», але не па лузе, а на дарожцы ў хлеў: аблажыў Сожвадою плёстаўскія лужкі, а падсушыла, дык не захацелася нешта мардаваца і забараніла барана... да сьвіней.

Так скончылася «індустрыялізацыя» плёсаўскай сел.-гаспадаркі, так адбылося яшчэ раз нязыходзячае галавацяпства... І скрабуць плёсаўскія бедакі патыліцы, і яшчэ цяпер недаўнешка пытаюцца: „І навошта грошы глумілі, навошта куплялі?

ЮНК.

ЗЕМЛЯЎПАРАДКАВАНЬНЕ ДАПАМОЖА КАЛГАСУ.

(Менская акр., Капыльскі р., Крывасёлкаўскі сельсавет).

Калгас арганізаваўся 20 красавіка 1928 году і цяпер мае восем сямействаў. Да гэтага часу не праведзена землеўпарадкаваньня вёскі Новасёлкі, што не дае магчымасьці членам калгасу будаваць калектыўныя будынкі.

Калі цяпер паглядзець на калгас, то ўбачым калектыўную знямлю ў ліку 32,75 гэктараў і апрацоўку зялі ўласнаю жывёлаю і інвэнтаром, а пасьля калектыўны падзел памiж членамі калгасу сабранага ўраджаю.

Большасьць членаў калгасаў стараюцца, каб найхутчэй правесьці землеўпарадкаваньне, а некаторыя спарыстоўваюць калгас, як добры прырабатак для індывідуальнае гаспадаркі. Аб гэтым Капыльскі РВК магчыма ня ведае, бо каб ведаў, то я думаю не адбывалася-б такое будаўніцтва калгасу на працягу больш як году.

Поруч з гэтым севазварот у калгасе трохпольны і члены ня ведаюць ці магчыма зрабіць другі, бо на працягу году ня бачылі ў калгасе куставога агранома, хіба мо' толькі ў м-ку Капылі. Прадстаўніноў, каб агляндзелі працу калгасу, РВК ня высылаў.

Землеўпарадкаваньне ў вёсцы Новасёлках выклікаецца і другімі ўмовамі. У вёсцы за год бывае па некалькі пажараў, дзякуючы вялікаму згусту будынкаў. Некаторыя сяляне пасьля апошняга пажару пачалі строіць будынкі ў полі. Я лічу, што ўсё сялянства чакае землеўпарадкаваньня, а ня толькі члены калгасу, бо вёска налічвае каля двух сотен двароў.

У. З.

Конкурс на лепшы ўраджай у калгасах.

Гомель, 11-8. Акрвыканкомам арганізавана акруговая камісія па правядзеньні конкурса на лепшы ўраджай у калгасах акругі. Для прэміраваньня калгасаў адпушчана 1000 руб.

Калгасы імя газ. „Савецкая Беларусь" і „Чырвоны Сьцяг" трэба аб'яднаць.

(Калінкавіцкі р., Мазыршчына).

На тры кілёмэтры адзін ад другога ў вёсцы Гарочыцы знаходзяцца калгасы імя газэты „Савецкая Беларась" і „Чырвоны Сьцяг". Кожны калгас набывае сабе сельска-гаспадарчыя машыны і прылады, якія скарыстоўваюцца ў гаспадарцы ў год ня больш месяца. Калі-б гэтыя калгасы аб'яднаць, то магчыма было-б аднымі машынамі абслужыць абодва калгасы, таксама магчыма было-б на два гэтых калгасы набыць трактар і іншыя буйныя с.-г. машыны.

Пашырэньне калгасаў магчыма было-б рабіць за лік тых зямель, якія знаходзяцца паміж калгасамі і праз год-два зямельная плошча зьлілася-б.

Калгаснікі калгасу імя газэты „Савецкая Беларусь" згодны на аб'яднаньне, згодны таксама частка калгаснікаў „Чырвоны Сьцяг".

Аб'яднаньне гэтых калгасаў дало б вялікую эканомію, за лік яной магчыма было-б падымаць і пашыраць гаспадарку. Каму належыць, трэба падумаць аб гэтым, даказаць не асазнаўшым і калгасы аб'яднаць, бо гэта выгадна.

В. ЛЯВОНІК.

Яшчэ некалькі слоў аб нашым Дразду.

(Калгас імя газэты «Савецкая Беларусь»).

Дрозд—былы старшыня калгасу „Савецкая Беларусь". Дрозд, які сарваў арганізацыю Гарочыцкай сельска-гаспадарчай камуны, якога малаціла ў друку газэта «Савецкая Беларусь», які даў слова і калгасу, што будзе прыкладна працаваць у калгасе. Дрозд, які сёньня яшчэ носіць у кішэні партыйны білет.

Будучы старшынёю калгасу, Дрозд праўленьня калгасу не прызнаваў, а гаварыў:

— Я старшыня і маю права рабіць.

— Добра,—адказывалі сябры праўленьня,—рабі, толькі рабі добра.

Поўтара месяца па праўленьні не вырашалася ні аднаго гаспадарчага пытаньня, а ўсе пытаньні вырашаў сам і так, як яму хацелася.

Вытворчы плян і заяўку на крэдыты на 1929-30 год Дрозд склаў сам і не паставіў ні на праўленьні ні на сходзе, а адаслаў у с.-г. крэдытнае т-ва.

Калгаснікі ўзьнялі пытаньне аб абагульненьні кароў.

— Ня дам абагуліваць кароў,—крычыць Дрозд.

Абагульненьне кароў мае вялікую значнасьць у калгасе, бо ня ўсе калгаснікі маюць каровы, а адсюль і ня ўсе ядзяць малако.

Дрозд масла прадае па 1 р. 20 к., а у другіх і малака для дзяцей няма.

Калгаснікі вымагалі абагульненьня кароў, вырашэньня пытаньняў праўленьнем, а Дрозд ня згодзен. Партячэйка дала дырэктыву Дразду выконваць пастанову сходу, а Дрозд і ня блізка.

На працу ня вышаў, а паехаў у Калінкавіцкі райком партыі і нагаварыў няпраўды--насклокнічаў.

Выехаўшая камісія з двух сяброў РВК—сяброў партыі—правяла сход калгасу, дзе высьвятлілася, што Дрозд вінаваты кругом.

Толькі адзін калгаснік быў на баку Дразда, а ўсе асуждалі працу Дразда. Абагульненьне маемасьці Дрозд называе грабяжом.

Калгаснікі ставілі пытаньне аб тым, каб Дразда выкінуць з калгасу, як разлагаюччага калгас. Дрозд згадзіўся выйсьці сам, а жонка і дзеці засталіся ў калгасе.

Адсюль трэба зрабіць вывад, што пры арганізацыі калгасаў трэба сачыць, каб у іх ня ўлезьлі Дразды, бо адзін Дрозд узбунтуе некалькі дзесяткаў сумленных калгаснікаў.

Трэба ачысьціць калгасы ад „драздоў" хаця-б і з партбілетамі, бо ня толькі калгас імя газэты «Савецкая Беларусь» меў «дразда», яны ёсьць і ў іншых калгасах.

Калгаснік.

Дзе лепш жыць?

Сельска-гаспадарчая арцель „Новае жыцьцё" в. Бярозаўка, Копыскага р., Аршанскай акругі існуе з 8 ліпеня 1928 г., а з 1922 г. і да гэтага часу існавала як т-ва па сумеснай апрацоўцы зямлі.

З пераходам на арцельны статут старыя сябры т-ва не захацелі агранаджваць цалкам свае гаспадаркі і частка з іх пашлі зноў карцець на сваёй вузкай, агароджанай межамі, палосцы зямлі, а новы склад сяброў калектыву і частка перадавых старога складу шчыра ўзяліся за працу.

Яны ўявілі сабе правільную лінію партыі і сав. улады ў неабходнасьці калектывізацыі сельскай гаспадаркі і за гэты кароткі тэрмін ужо ўведалі смак калектыўнага жыцьця. Напрыклад, адзін седзяніи пытае ў сябра калектыву:

— Скажы мне, калі ласка, дзе лепш жыць—у калектыве, ці на сваёй індывідуальнай гаспадарцы?

Сябра калектыву яму адказвае:

— Няхай мне цяпер даюць дарам 10 гэктараў зямлі з пасевамі, будоўлю і наогул цэлую сялянскую гаспадарку, дык адмоўлюся, бо дзе я адзін на сваёй гаспадарцы працаваў тры дні, дык у калектыве гэтую працу я зраблю за адзін дзень.

Далей прыводзіць прыклад зімовай працы—гэта малацьбы, ён кажа:

— Мы сваю малацьбу машынай канчаем з восені за некалькі дзён і прымаемся за другую працу, а калі няма другой працы, дык зможам і адпачыць, а з вакольных вёсак цэлую зіму, з досьвітку і да вечару чуеш гукі цапоў. Ад гэтай малацьбы яны, папершае, пераўтамляюцца, а падругое, палову сабранага ўраджаю паядаюць мышы.

Такога-ж погляду і настрою ўсе сябры к-тыву. Маемасьць іх уся аграмаджана: жыве тут 17 сямействаў і 4 адзіночкі. Зямлі ім адведзена 171,02 гэктара. Саду маецца 19,66 гэкт., які каштуе 14600 руб.; пітомнік займае плошчу 0,75 гэкт. Зайшоўшы ў сад, зразу адчуваеш, што ў ім маецца гаспадар, які зацікаўлен сваёй маемасьцю і яе разьвіцьцём. Сад надзвычайна добра агледжан, мае прыгожы гаспадарскі выгляд і ў гэтым годзе дасьць шмат пладоў.

У пасевах прымяняюцца агрыкультурныя палепшаньні: палі засеваюцца ачышчаным, пратручаным і часткай чыстагатункавым насеньнем, падымаюцца раньнія пары і ўжываюцца мінэральныя ўгнаеньні. Імкнуцца ўсё болей завесьці завадзкой жывёлы, напр., ужо маецца з 32 штук рагатай жывёлы 21 завадзкіх і палепшаных галоў, маецца надзвычайна прыгожы жарабец-вытворца з пароды арлоўскіх рысакоў, бугай ангельскай пароды і бораў буйнай ангельскай пароды.

У калектыве вядзецца і культурна-асьветная праца. Тут маецца школа і чырвоны куток, але-ж яшчэ недастаткова разгорнута культасьветная праца сярод жанчын, якія яшчэ зачастую з-за свае няпісьменнасьці, за якое-небудзь маленькае глупства заводзяць споры.

Калектыў складзен з часткі былых панскіх рабочых, часткі сялян-беднякоў і часткі сераднякоў. Такі склад, бязумоўна, змог добра паставіць і ўнутраную арганізацыю працы. Выходзяць яны на працу з 4 гадз. раніцы і працуюць да 12, а потым з 3 дню і да вечару.

Аб калектыве і яго працы добра адгукаецца вакольнае насельніцтва і ён, бязумоўна, зьяўляецца прыкладам астатняму сялянству ў вядзеньні сельскай гаспадаркі.

Захарык.

Посьпехі жывёлагадоўлі ў савгасах.

Эканамічныя ўмовы сельскай гаспадаркі Беларусі спрыяюць разьвіцьцю жывёлагадоўлі і ставяць яе ў аснову ўсёй сельскай гаспадаркі, зьяўляючыся адной з галоўных яе таварных галін. Асабліва спрыяючыя ўмовы дзеля разьвіцьця жывёлагадоўлі маюць савгаспадаркі з іхнімі кармавымі базамі. Для характарыстыкі кармавога пытаньня па савгаспадарках у сучасны момант неабходна прыняць пад увагу наступныя лічбы: у 1928 годзе савгасы мелі 68 тыс. тон грубых кармоў (сена, саломы, мякіны), прычым у гэтую колькасьць не ўваходзяць лугавыя гаспадаркі, якія маюць яшчэ 24 тыс. тон для харчаваньня 7311 дойных кароў і 3646 рабочых коняй. Ня ўлічваючы нават сена лугавых гаспадарак, па савгасах было каля 36 тысяч тон лішкаў грубых кармоў. Маючы вялікую колькасьць лішкаў грубых кармоў, савгаспадаркі стараліся як мага больш скарыстаць іх для жывёлы, каб атрымаць больш гною, і часткова нават сена ішло на подсьціл. Вынікам такога скарыстаньня грубых кармоў зьявілася стратнасьць жывёлагадоўлі. На 1 студзеня 1929 г. савгаспадаркі мелі 40280 гэкт. ворыва, 5625 гэкт. заліўной сенажаці, 5968 гэкт., сухадольнай і 20302 гэкт. балотнай, што ў адносінах ральлі да сенажаці складае 1,26:1.

У адносінах сакавітых кармоў дзеля кармленьня жывёлы ўзімку мы маем таксама колькасьць, якая спрыяе разьвіцьцю жывёлагадоўлі. У 1927 г. пад бульбаю было 4186 гэктараў, кораньплодамі ў полі—216 гэкт., кораньплодамі ў гародзе—270 гэкт., што складае 11,5% усёй засеўнай плошчы.

Калі зьвернемся да моцных кармоў, дык тут ёсьць шмат недарэчнасьцяў, бо савгаспадаркі забясьпечаны ня больш як на 30 проц. патрэбнай колькасьці, што, зразумела, мае сувязь з агульным скарачэньнем завозу моцных кармоў з-за межаў БССР.

Падагульваючы кармавое пытаньне ў савгаспадарках, патрэбна адзначыць, што адначасна з вялікаю колькасьцю грубых кармоў, якіх мы маем лішкі, у нас не стае кораньплодаў і моцных кармоў.

Таму трэба зьвярнуць больш увагі на кораньплоды. Што-ж датычыцца моцных кармоў, як макуха і высеўкі, дык савгасы павінны ў значнай ступені зжыць гэты крызіс у сябе дома, не спадзяючыся на значны ўвоз. Па гэтым пытаньні савгаспадаркі прымаюць цэлы шэраг мерапрыёмстваў, да якіх адносяцца: увядзеньне ва ўсіх савгаспадарках сіласаваньня, пашырэньне плошчы пад засевамі канюшыны, пашырэньне плошчы пад кораньплодамі, сэрадэляй і вікай.

У 1930 г. гаспадаркі ў сярэднім будуць мець на адну дойную карову на зіму 8 кіло ў суткі кораньплодаў, калі ў 1927 годзе яны мелі ў сярэднім на адну дойную карову ўсяго 4 кіло. Ня гледзячы на гэта, усё-ж мала зьвернута ўвагі на пытаньне культуры кораньплодаў, якія па патрабаваньню жывёлагадоўлі павінны займаць у канцы пяцігодкі ня менш 10 проц. ад усёй засеўнай плошчы, што дасьць тады магчымасьць даць зімой у сярэднім на адну дойную карову да 25 кіло ў суткі. Мала зьвернута ўвагі на сілос, бо пяцігодка не прадугледжвае пасеў спэцыяльных культур дзеля гэтай мэты, недастаткова зьвернута ўвагі на культуру бабовых на зярно дзеля кармленьня жывёлы, мала зьвернута ўвагі на скарыстаньне барды, якой ёсьць вялікія лішкі.

Вялізарнае значэньне жывёлагадоўлі ў савгаспадарках выцякае з агульнага валавага звароту гаспадаркі. У 1925 г. з агульнага валавага звароту ў суме 785 тыс. руб. на жывёлагадоўлю адносена 108 тыс. руб., або 13,7 проц.; у 1926 г. з агульнага валавага звароту ў 4316 тыс. руб. на жывёлагадоўлю прыпадала 1694 тыс. руб., або 39,2 проц.; у 1927 г. з агульнага валавага звароту 6518 т. р. на жывёлагадоўлю прыпадае 2614 тыс. руб. або 43,2 проц. Удзельная вага галіны жывёлагадоўлі ў валавым звароце расьце шпаркім тэмпам. Калі параўнаць павялічэньне агульнага валавага звароту з павялічэньнем звароту жывёлагадоўлі, дык і тут ёсьць значнае дасягненьне ў галіне жывёлагадоўлі; звароты па жывёлагадоўлі растуць значна шпарчэй, чымся расьце агульны валавы зварот.

Такі шпаркі тэмп разьвіцьця таварнасьці жывёлагадоўлі ўсё-ж ня вельмі вялікі—ён павінен ісьці шпарчэй, калі-б савгасы былі больш забясьпечаны буйнай рагатай жывёлай. У сучасны момант па савгаспадарках ёсьць каля 40 проц. патрэбнай колькасьці жывёлы, што галоўным чынам тлумачыцца тым, што жывёлагадоўля ў момант арганізацыі савгаспадарак амаль зусім адсутнічала і ў далейшай працы савгаспадарак адсутнічалі крэдыты па жывёлагадоўлі. Але-ж трэба прызнаць, што савгасы па пытаньні п вялічэньня буйнай рагатай жывёлы дасягнулі значных вынікаў. Трэставаныя савгаспадаркі, пачаўшы сваю арганізацыю ў 1920 г., значна пашырылі ўласнае стада. Аднак, забясьпечанасьць жывёлай савгаспадарак у параўнаньні з калгасамі і сялянскімі гаспадаркамі значна меншая. У 1928 г. рабочых коняй у калгасах на 100 гэк. было 18,0, у сялян 25,8 у савгаспадарках 9,0. Але-ж прымаючы пад увагу, што ў савгасах працуюць сёлета каля 70 трактараў, цягавай сілай савгасы забясьпечаны амаль што на ўсе 100 проц. Пераход на трактары яшчэ больш зьнізіць забясьпечанасьць савгаспадарак коньмі, такім чынам у канцы пяцігодкі праэктуецца зьнізіць колькасьць коняй да 8,6 штук на 100 гэкт. пасеву.

Калі зьвярнуцца да пытаньня аб буйнай рагатай жывёле, дык убачым вялікае небясьпеку ў гэтай галіне. Напрыклад, у калгасах у 1927 г. было 37,1 у насельніцтва 39,4, а ў савгасах усяго 15,3 галоў на 100 гэкт. ворыва. Гэткае зьявішча назіраецца таксама і ў адносінах сьвіней: у 1927 г. на 100 гэкт. ворыва ў калгасах было 14,4, у насельніцтва 23,6, а ў савгаспадарках усяго 1 сьвіня. Забясьпечанасьць буйнай рагатай жывёлай у сучасны момант складае каля 40 проц. патрэбнай колькасьці. У канцы пяцігодкі колькасьць дойных кароў павінна быць даведзена да 25.000 галоў, або ад 54,6 гал. на 100 гэкт. ральлі, бо ў канцы пяцігодкі мы будзем мець звыш 100 тыс. тон грубых кармоў.

Апрача колькаснага павялічэньня стада, будзе весьціся і якаснае палепшаньне жывёлы.

У напрамку павялічэньня прадукцыйнасьці кароў ёсьць шмат дасягненьняў. Павялічэньне ўдойлівасьці ідзе шпаркім тэмпам. Сярэдні гадавы ўдой аднэй каровы па ўсіх савгасах у 1924 годзе быў 917 кіл., у 1925 г. —1146 кіл., у 1926 г.—1539 кіл., у 1927 г.—1724 кіл., у 1928 г.—1883 кіл., а ў канцы пяцігодкі яго трэба давесьці па ўсіх савгасах ня менш як да 2500 кіл. Шэраг савгаспадарак з чырвона-нямецкай, чырвона-беларускай, яраслаўскай, швэцкай і галяндзкай жывёлай, па даных 1927 г., значна перавысілі гэты ўдой і максымальны сярэдні гадовы ўдой аднэй каровы па аднаму савгасу быў 2900 кіл. Завезеная з Даніі чырвоная дацкая жывёла ў колькасьці 35 дойных кароў па ўмовах Беларусі адчувае сябе добра; ёсьць каровы, якія за 10 мес. свайго жыцьця ў савгасе далі амаль 5000 кіл. малака.

Пры разьмеркаваньні новай буйнай рагатай жывёлы прадугледжваецца арганізацыя малочных фэрмаў дзеля забясьпечаньня гарадоў малаком.

Сьвінагадоўлі ў савгасах да апошніх гадоў не давалі адпаведнага месца. Зараз перад савгаспадаркамі ва ўсю шырыню паўстала пытаньне аб значным павялічэньні сьвіназавод

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА

Савету Народных Камісараў БССР

пра абавязковае дзяржаўнае страхаваньне работнікаў ляснічтваў на выпадак гвалтоўнай сьмерці ці калецтва іх у сувязі з выкананьнем службовых абавязкаў і пра забясьпечаньне іх сем'яў.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Правесьці з пачатку 1929-30 бюджэтнага году абавязковае дзяржаўнае страхаваньне лясьнікоў, аб'ездчыкаў на выпадак гвалтоўнай сьмерці ці калецтва ў сувязі з выкананьнем імі службовых абавязкаў.

2. Даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства і Кіраўніцтву Дзяржаўнага Страхаваньня зрабіць генэральны дагавор аб застрахаваньні паказаных у арт. I гэтае пастановы работнікаў. У гэтым дагаворы павінен быць прадугледжан абавязак Народнага Камісарыяту Земляробства выплачваць Кіраўніцтву Дзяржаўнага Страхаваньня страхавыя прэміі па льготнаму тарыфу з страхавой сумы у 1000 руб. на выпадак сьмерці і 1000 руб на выпадак інвалідносьці застрахаваных.

3. Устанавіць у каштарысе Народнага Камісарыяту Земляробства выдачу аднаразовых дапамог усім лясным работнікам, якія мелі матарыяльную страту ад падпалу, рабаваньня і іншых гвалтоўных дзеяньняў у сувязі з выкананьнем імі службовых абавязкаў.

Разьмер аднаразовых дапамог у кожным паасобным разе вызначаецца Народным Камісарыятам Земляробства разам з Цэнтральным Праўленьнем Саюзу сельскагаспадарчых і лясных рабочых.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **М. Карклін.**

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР **М. Калевіч.**

7 жніўня 1939 г.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Совета Народных Комассаров БССР

об обязательном государственном страховании работников лесничества в случае насильственной смерти или телесного повреждения их в связи с выполнением служебных обязанностей и об обеспечении их семей.

Совет Народных Комиссаров БССР постановляет:

1. Провести с начала 1929-30 бюджетного года обязательное государственное страхование лесников, об'ездчиков в случае насильственной смерти или телесного повреждения в связи с выполнением ими служебных обязанностей.

2. Поручить Народному Комиссариату Земледелия и Правлению Государственного Страхования заключить генеральный договор о застраховании указанных в ст. I настоящего постановления работников. В означенном договоре должна быть предусмотренна обязанность Народного Комиссариата Земледелия выплачивать Правлению Государственного Страхования страховые премии по льготному тарифу со страховой суммы в 1000 руб. в случае смерти и 1000 руб. в случае инвалидности застрахованных.

3. Установить по смете Народного Комиссариата Земледелия выдачу единовременных пособий всем лесным работникам имевшим материальный ущерб от поджога, грабежа и других насильственных действий в связи с выполнением ими служебных обязанностей.

Размер единовременных пособий в каждом отдельном случае определяется Народным Комиссариатом Земледелия совместно с Центральным Правлением Союза сельско-хозяйственных и лесных рабочих.

Зам. Председателя Совета Народных Комиссаров БССР **М. Карклин.**

Управляющий Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР **М. Калевич.**

г. Минск. 7 августа 1929 г.

Прафсаюзы Беларусі дапамагаюць піанэрарганізацыі.

На піанэрработу з саюзных сродкаў адпускаецца 2 проц. культ. фонду, што складае каля 23.000 рубл. у год. Апошняе паўгодзьдзе дало значны рост выдаткаў на піанэрработу. Так па 6-ці саюзам (чыгуначнікі, швэйнікі, савгандльслужачыя, будаўнікі і хімікі) —выдаткі на піанэрработу за ўвесь 1928 г. складалі 13.663 руб., а за першае паўгодзьдзе 1929 г. без выдаткаў, зьвязаных са зьлётам піанэраў і аздаравіцельнай работай, складаюць —9.384 руб., што дае павялічэньне на 37 проц. супроць мінулага году; па 3-м саюзам, якія маюць зьвесткі толькі па г. Менску рост выдаткаў дае 183 проц. супроць мінулага году. Гэта сьведчыць аб тым, што ўвага прафарганізацый да піанэр. работы ў апошні час значна павялічылася.

Удзел праф. арганізацый у падрыхтоўцы піанэрскіх зьлётаў (акруговых і Усебеларускага) ужо асьвятляўся ў друку. Агульныя выдаткі прафсаюзаў на піанэрскі зьлёт (дапамога штабам, выдаткі піанэрбазам і піанэратрадам у зьвязку са зьлётам) складаюць па ЦСПСБ, ЦП саюзаў і Акр. Праўленьням ня менш 8.000 руб.

Акаль усе праф. арганізацыі ўдзельнічаюць у арганізацыі піанэрскіх лягераў і інш. аздаравіцельных мерапрыемствах, на што ў гэтым годзе толькі па 4-м саюзам г. Менску (прац. асьветы, швэйнікі, дзеравапрацаўнікі і прац. мастацтва) было выдаткавана 1.295 руб., а калі ўзяць усе саюзы, дык гэта будзе складаць толькі па Менскай акрузе каля 5-6 тыс. рубл.

Прафсаюзныя клюбы вылучаюць спэцыяльныя пакоі для піанэр. арганізацый, а таксама праводзяць ранішнікі для дзяцей. Так па 103-м клюбам у 1928 г. за м-ц было праведзена 75 ранішнікаў. Такая колькасьць зьяўляецца, бязумоўна, недастатковай і павінна быць на крайняй меры ўтроена, каб кожны клюб праводзіў ня менш 2-х ранішнікаў у месяц.

Дзіцячых пакояў пры клюбах мелася ў 1928 г.—10, у апошнія часы іх колькасьць некалькі павялічылася, але ўсё-ж яшчэ недастаткова. Новае клюбнае будаўніцтва дасьць, бязумоўна, большую магчымасьць у напрамку лепшай дапамогі піанэр. арганізацыям і лепшай пастаноўкі работы сярод дзяцей рабочых, якая зачастую ўпіраецца ў пытаньне адсутнасьці патрэбных памяшканьняў, бо толькі 32 клюбы маюць 8 і больш пакояў з 120 клюбаў па Беларусі.

У прафсаюзных бібліятэках дзіцячай літаратуры маецца 21.397 кніжак, альбо 3,9 проц. да агульнага бібліятэчнага фонду саюзаў. У апошні год набыта 8.000 кніжак.

Прафсаюзныя арганізацыі таксама ўдзельнічаюць у рабоце савецкіх органаў па пытаньням аховы здароўя дзяцей, палепшаньня школьнага і дашкольнага выхаваньня, школьнаму і клюбнаму будаўніцтву. Апрача таго, большасьць ЦП і АПС, а таксама буйныя ФЗМК маюць саюзныя дзіцячыя пляцоўкі, сады, альбо дапамагаюць існуючым.

Аднак, работа праф. арганізацый па абслугоўваньню дзяцей, палепшаньню выхаваньня іх і дапамозе піанэрарганізацыям ня можа яшчэ лічыцца здавальняючай і павінна быць значна ўзмоцнена. У прыватнасьці, патрэбна ўзмацніць практычную дапамогу сваім піанэр. атрадам, азнаёміўшыся з іх канкрэтнымі запатрабаваньнямі і недахопамі ў рабоце. Патрэбна большая масавая работа сярод рабочых навокал пытаньняў выхаваньня дзіцяці ў сям'і, большая барацьба з п'янкай бацькоў, а падчас і спаіваньнем дзяцей, прымусам удзельнічаць у рэлігійных забабонах, наогул з адмоўнымі зьявішчамі быту, якія часта адмоўна ўплываюць на дзяцей. Патрэбна вызначыць у клюбнай рабоце самастойнае месца для работы з дзяцьмі: ранішнікі ня меньш 2-х раз у месяц, падбор адпаведных кіно-карцін, дзіцячыя пакоі па магчымасьці ў кожным клюбу, прадстаўленьне клюбных пакояў для работы піанэр. атрадаў, павялічэньне і якаснае палепшаньне дзіцячай літаратуры ў саюзных бібліятэках.

Самае галоўнае. Трэба катэгарычна выжыць маючыяся ў некаторых праф. работнікаў тэндэнцыі ўсю дапамогу піанэр. арганізацыі зьвесьці да грашовай дапамогі неразуменьне палітычнай важнасьці гэтага пытаньня.

Выхаваньне новае зьмены рабочае клясы, пазбаўленай адмоўных момантаў: п'янства, дрэнных адносін да вытворчасьці і г. д., выхаваньне сьвядомага рабочага-калектывістага, беззаветна адданага справе пабудовы сацыялізму, інтэрнацыянальна-выхаванага—гэта справа ня толькі грашовай дапамогі, нават менш за ўсё грашовай дапамогі, гэта справа пастаноўкі выхаваўчай работы.

Барацьба за моладзь, якую вядуць клясавыя ворагі, патрабуе ад пралетарскіх арганізацый максымальна напружанага адпору, гібкай пастаноўкі сваёй выхаваўчай работы сярод моладзі. Гэтага зачастую не разумеюць асобныя праф. работнікі і праф. органы, не разумеюць, што гэта работа не кампанійская, а штодзённая. Гэтым паміж іншым тлумачыцца, у значнай меры, малая прысутнасьць прафсаюзаў у час піанэр. параду, ня гледзячы на стала-праведзеную работу па дапамозе піанэрскаму зьлёту, тлумачыцца некаторым непаразуменьнем і няўважлівасьцю да піанэр. работы, якія бываюць на мясцох: несваечасовая выдача грошай, адмаўленьне ад дачы памяшканьняў, адсутнасьць працаўнікоў ФЗМК, Акр. Праўленьняў на занятках піанэр. атрадаў і г. д.

З гэтым трэба пакончыць. Піанэры маюць права патрабаваць дапамогі. Праф. арганізацыі, нягледзячы на ўсю недастатковасьць нашых культ. фондаў, могуць і павінны адшукаць грошы і час для таго, каб дапамагчы.

М. Клімковіч.

ТВОРЧАСЬЦЬ ДЗЯЦЕЙ.

(На выстаўцы працы піанэраў Беларусі).

У пакоў 2-й школы на Ленінскай вуліцы перапоўнены экспанатамі.

З першых дзён пакоі запоўнены наведвацелямі, сярод якіх ня толькі моладзь, але і дарослыя, якія прыйшлі паглядзець на творчасьць сваіх дзяцей.

Абыходзім пакоі.

Піанэры і сельская гаспадарка. Тут даецца наглядны паказ удзелу піанэраў у паходзе за ўраджай і калектывізацыю, асобныя моманты разьвіцьця сельскай гаспадаркі Беларусі.

Найбольш цікавым—аддзел „праца і тэхніка піанэраў"; вось электрычны трамвай павольна коціцца на драцяных рэйках; вось маленькі фото-апарат, які робіць розныя здымкі, радыёпрыёмнікі —зробленыя дзяцьмі 12—15 гадовага ўзросту.

Перад намі пакой—праца дзяцей. Вось розныя работы, зробленыя 6—10 гадовымі „карапузамі". Маленькія рукі, а выробляюць добрыя цікавыя рэчы.

Малюнкі. Іх тут шмат: малюнкі прагадыроў партыі і ўраду, намалёваныя маладымі мастакамі—выклікаюць увагу

Сярод прац дзяцей ёсьць розныя інструманты, розныя мадэлі: аэраплянаў, аўта-машын, бронь-аўтамабіляў, прапэляраў і г. д.

На выстаўцы маецца аддзел дзіцячай літаратура і насьценгазэты. Тут, прадстаўлены лепшыя насьценгазэты раёнаў, Менскіх атрадаў. Наглядаецца ўмеласьць у выданьні газэт. Шмат піанэрскіх насьценгазэт могуць быць прыкладам для дарослых.

На меншую цікавасьць выклікае аддзел вайскова-фізкультурнай працы ў піанэр-атрадах.

Выстаўка творчасьці дзяцей Беларусі выклікала асаблівую зацікаўленасьць з боку працоўных. Выстаўку наведаў генэральны сэкратар ЦК КП(б)Б тав. Гамарнік.

За першы дзень працы выстаўкі яе наведала звыш 1.500 чалавек.

У кнігах водгукаў маецца шмат дадатных адзнакаў аб працы дзяцей.

М.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ПРЫЗЫВУ 1907 г.

На апошнім пасяджэньні прэзыдыуму Менскага Акруговага Выканаўчага Камітэту была абгаворана інфармацыя аб падрыхтоўцы да прызыву ў Чырвоную армію моладзі нараджэньня 1907 г.

З інфармацыі відаць, што падрыхтоўчая праца па правядзеньню прызыву разгорнута, але разам з тым яшчэ недастаткова праводзіцца праца па клясаваму адбору прызыўнікоў. Асабліва ў гэтым напрамку адстае Заслаўскі райён. Праца па клясаваму адбору яшчэ не зрабілася масавай працай нашых саветаў, у гэту працу ня ўцягнута батрацтва і сялянская беднота.

Усім райвыканкомам запрапанавана зьвярнуць больш сур'ёзную ўвагу на правядзеньне клясавага адбору прызыўнікоў. Назакол гэтай працы павінна быць згрупавана грамадзкая думка і ўцягнута ў яе батрацтва і беднота. Для гэтай мэты асабовыя сьпісы прызыўнікоў павінны быць абгавораны на сходах груп беднаты. Нам трэба дабіцца, каб ні адзін клясава-чужы прызыўнік ня быў дапушчан у Рабоча-Сялянскую Чырвоную армію.

Клясавы адбор па гораду Менску даручана правесьці Менскаму гарсавету, пры якім утвараецца спэцыяльная камісія. Гарсавету запрапанавана заслухаць даклад адміністрацыйнага аддзелу аб ходзе працы па выяўленьню клясава-чужога і сацыяльна небясьпечнага элемэнту.

Для растлумачэньня задач прызыву па сельсаветах будуць праводзіцца сходы прызыўнікоў. На сходах будуць рабіцца даклады аб міжнародным становішчы і задачах Чырвонай арміі, а таксама аб яе гісторыі і прызыве.

Інспэктару аховы здароўя дадзена ўказаньне вылучыць дактароў у прызыўныя пункты для правядзеньня мэдыцынскага агляду прызыўнікоў, а таксама забясьпечыць прызыўныя камісіі адпаведным абсталяваньнем і прыладамі. У часе прызыву дактарамі будуць праводзіцца лекцыі і гутаркі на санітарна-асьветныя тэмы.

Для правядзеньня прызыву вырашана арганізаваць 6 прызыўных пунктаў: у Менску—для прызыўнікоў гораду і Заслаўскага, Койданаўскага раёнаў і ў Барысаве—для гарадзкіх прызыўнікоў, а таксама для Барысаўскага, Бягомльскага, Плешчаніцкага і Халопеніцкага раёнаў; у м. Пухавічы, які павінен будзе абслужыць апрача Пухавіцкага, Самахвалавіцкі і Ўзьдзенскі раёны; у м. Смалявічах—Смалявіцкі, Сьмілавіцкі, Астрашыцка-Гарадзецкі і Лагойскі раёны; у Чэрвені будуць прызыўнікі Чэрвенскага і Бярэзінскага раёнаў і ў м. Грозаве — Грэскага і Копыльскага раёнаў.

Райвыканкомам запрапанавана вылучыць у прызыўныя камісіі аўтарытэтных прадстаўнікоў. Прадстаўніком акрвыканкому ў Менскую прызыўную камісію вылучан т. Сасункевіч. Інспэктарыяту Нарасьветы даручана арганізаваць у часе прызыву ў клюбах, нардамох, хатах-чытальнях і на чыгуначных станцыях палітыка - асьветную працу. Побач з гэтым інспэктар палітасьветы павінен будзе прыняць актыўны ўдзел у наладжваньні палітасьветнага абслугоўваньня прызыўнікоў на агітпунктах пры прызыўных камісіях.

Падумаў акрвыканком і аб абслугоўваньні прызыўнікоў спажывецкай каапэрацыяй. Так, Барысаўскаму і Менскаму цэрабкопам прапанавана на ўвесь час прызыву арганізаваць свае ларкі на чыгуначных станцыях, а таксама на прызыўных пунктах у гарадох. Белкаапсаюз павінен будзе арганізаваць такія-ж ларкі на райёных прызыўных пунктах.

Прызыў распачнецца з 15 верасьня.

ХРОНІКА.

Усебеларускі зьлёт піанэраў.

Сустрэча з чырвонымі байцамі.

Усе ўдзельнікі ўсебеларускага зьлёту піанэраў арганізавалі масавы выезд у чырвонаармейскія лягеры.

Піанэры наведвалі чырвонаармейскія палаткі, клюбы, сталоўкі і інш.

У лягерах адбыліся спаборніцтвы па стральбе і плаваньню.

Ад'езд дэлегатаў.

Сёньня ўсе ўдзельнікі зьлёту ад'яжджаюць да дому. З ліку дэлегатаў 200 чалавек накіроўваюцца на ўсесаюзны зьлёт юных ленінцаў у Маскву.

Скарбоначны збор.

Учора дэлегаты Усебеларускага піанэрскага зьлёту наладзілі скарбоначны збор на карысьць дзіцячых камуністычных арганізацый у капіталістычных краінах.

Тэмп будаўніцтва фабрык павольны.

З абсьледваньня новага будаўніцтва па лініі прамысловасьці ВСНГ Бел. відаць, што будаўніцтва разгорнута яшчэ недастаткова энэргічна.

Толькі ў жніўні месяцы пачалося будаўніцтва гомельскага камбінату Лесбела. Будаўніцтва ў Бабруйску ідзе павольным тэмпам з-за недахопу цэглы. З будаўніцтвам Барысаўскага камбінату таксама спазьніліся, бо праэкты пераапрацоўваліся, а таму новыя прадпрыемствы ў вызначаны тэрмін ня будуць пушчаны ў ход.

Новая запалкавая фабрыка „Чырвоная Бярэзіна" павінна была, згодна пляну, быць пушчана з 1 жніўня, але і тут будаўніцтва зацягнулася і яна будзе пушчана не раней сьнежня.

Папяровая фабрыка „Гэрой Працы" у Добрушы таксама адстае ад нармальнага тэмпу будаўніцтва,—работа па пабудове новай сілавой станцыі разгортваецца вельмі слаба.

Іншае будаўніцтва ў галіне папяровай прамысловасьці паводле пляну павінна быць скончана ў чацьвёртым квартале будучага году, але і тут, відаць, у тэрмін скончана ня будзе, бо зацьверджаньне праэктаў праходзіць з вялікім спазьненьнем і ў іх уносіцца шмат паправак.

Ня будзе скончана да 15 лістапада (як вызначалася) і будаўніцтва фабрыкі „Вітшвэй". Пытаньне з пабудовай Бабруйскай швэйнай фабрыкі пакуль што вісіць у паветры.

Па ўсяму будаўніцтву адчуваецца значны недахоп цэглы. З 15 жніўня будуць пушчаны 5 новых цагляных заводаў, якія яшчэ ў бягучым сэзоне выпусьцяць пяць мільёнаў цэглы і тады становішча з будаўніцтвам рэзка палепшыцца.

Выгады здачы аблігацый пазыкі на хаваньне.

У галоўную касу ашчаднасьці здадзена калектывамі на хаваньне з кіраўніцтвам аблігацый 2-й пазыкі індустрыялізацыі на 450.000 руб.

Па атрыманьні табліц апошняга тыражу, каса ашчаднасьці ў той-жа дзень праверыла аблігацыі і паведаміла іх уласьнікаў аб прыпаўшых выйгрышах.

Усяго паслана 186 паведамленьняў. Выйгрышаў прыпала на аблігацыі, здадзеныя на хаваньне на суму каля 4.000 р.

Гута „Пролетары" аднаўляе працу.

У бліжэйшыя дні пасьля 6-цітыдневага перапынку аднаўляецца праца на шкляной гуце „Пролетары".

На гуце праведзен вялікі рамонт пячэй

Як ідзе страхаваньне батрацтва.

Саюзам с.-г. і лясных рабочых падагулен матар'ял аб ходзе працдагаворнай работы і сацыяльнага страхаваньня батрацтва.

Усяго па Беларусі заключана 43.194 працдагавораў, заданьне выканана на 72 проц; ахоплена страхаваньнем 23.539 батракоў, альбо 80 проц.—заданьня.

Прэзыдыум саюзу ўхваліў мабілізаваць увагу прафактыву навакол поўнага па заключэньню дагавораў і страхаваньню батрацтва. Для пасьпяховага правядзеньня гэтых мерапрыемстваў у вёсках будуць накіраваны рабочыя брыгады.

Аб школе ФЗВ мэталістых.

Згодна вестак Белмэталётрэсту школу ФЗВ мэталістых мяркуецца адчыніць у кастрычніку м-ца бягучага году на Віцебскім заводзе „Чырвоны Мэталіст". У школу будуць прымацца ў першую чаргу дзеці рабочых-мэталістых.

Перакваліфікацыя ўрачоў.

НК аховы здароўя накіроўвае на зімовы пэрыяд у Ленінград для павышэньня ведаў і ўзьняцьця кваліфікацыі 24 беларускіх урачоў.

Месцы разьмеркаваны па акругах. прычым Менскай акрузе прадастаўлены 3 месцы. На курсы будуць у першую чаргу накіроўвацца сельскія ўрачы,

Падрыхтаваны 3.000 пар лыж.

РВА ЦСПСБ закуплена для будучага зімовага сэзону 3.000 пар лыж. Кошт аднэй пары—8 рублёў.

Лыжы ў першую чаргу адпушчаюцца па калектыўным заяўкам прафсаюзным арганізацыям.

Новы атрад клюбных працаўнікоў.

Гэтымі днямі заканчваюцца заняткі на ўсебеларускіх курсах клюбных працаўнікоў. Курсы скончылі 40 чалавек, у большасьці рабочыя.

Усе слухачы курсаў 16 жніўня выяжджаюць у Маскву, дзе будуць азнаёмлівацца з пастаноўкай працы маскоўскіх клюбаў.

Як выконвалі калдагавор.

Інструктарам саюзу дрэваапрацоўшчыкаў праведзена абсьледваньне ступэні выкананьня калдагавораў.

Праверка выявіла грубыя парушэньні калдагавору і асабліва шмат парушэньняў па ахове працы.

На заводзе „Камінтэрн" практыкаваўся прыём рабочых акрамя біржы працы, па некаторым цэхам няма вэнтыляцыі, вучні не атрымлівалі спэцвопратку.

На ф-цы „Адражэньні"—яшчэ дагэтуль ня ўтворана вучнёўская брыгада.

На заводах „Пролетары", „Зьвязда" і „Чырвоны Кастрычнік" вельмі часта практыкуюцца звышгэрміновыя працы. Памяшканьні гэтых заводаў знаходзяцца ў антысанітарным становішчы, па многіх цэхах адсутнічае вэнтыляцыя, шмат гразі ў прэсах і г. д.

На большасьці прадпрыемствах часовым рабочым не выдавалася спэцвопратка.

Вучням працуючым па 1-му разраду на „Чырвоным Кастрычніку" ня былі прадстаўлены кватэры.

Аналёгічныя выпадкі парушэньня дагавору выяўлены і на прадпрыемствах Бабруйшчыны. Саюз катэгарычна прапанаваў усім гаспадарнікам выканаць прынятыя абавязкі па калдагавору, у выпадку невыкананьня—вінаватыя будуць прыцягнуты да судовай адказнасьці.

Фізкультурныя сустрэчы.

Мэталісты—клюб Р. Люксэмбург.

Гэтымі днямі на стадыёне МБВ адбыўся футбольны матч паміж спортыўнымі камандамі саюзу мэталістых і клюбу Р. Люксэмбург.

У час гульні лепшую падрыхтаванасьць паказала каманда клюбу імя Р. Люксэмбург. Гульні скончыліся 2:0 у карысьць каманды клюбу.

Менск—Барысаў.

У Менск зьвярнулася з Барысаву каманда клюбу Р. Люксэмбург, дзе была праведзена таварыская сустрэча з рабочымі фізкультурнікамі заводу „Домбаль".

Гульня ў баскет-бол—скончылася перамогай домбальцаў.

Па футболу пяршынство ўзяў Менск. Вынікі гульні 4:5.

Сустрэчы выклікалі вялікую зацікаўленасьць з боку рабочых г. Барысаву.

Камісіі РСІ пры райвыканкомах

Па Аршанскай акрузе распачалася праца па арганізацыі камісій рабоча-сялянскай інспэкцыі пры кожным райвыканкоме. Работа па арганізацыі камісій будзе скончана ў жніўні месяцы. У сучасны момант праводзіцца шырокая растлумачыцельная праца сярод сялянства аб мэтах і задачах камісій РСІ пры райвыканкомах і каб дабіцца найбольшага ўцягненьня батрацкага і бяднацка-серадняцкага актыву ў работу камісій.

Наступны нумар газэты „Савецкая Беларусь" выйдзе ў суботу 17 жніўня г. г.

БУДУЕЦЦА НОВЫ МЕНСК.

(З ПЛЕНУМУ МЕНСКАГА ГАРСАВЕТУ).

З лістапада пачне функцыянаваць каналізацыя.

Гаспадар гораду—пленум гарадзкага савету—гэтымі днямі падвёў вынікі гарадзкога будаўніцтва і пункт за пунктам вызначыў плян на паляпшэньню дабрабыту Менску на чарговы гаспадарчы год.

Кожны з нас зьяўляецца сьведкай, як вуліцы гораду капаюцца, укладваюцца трубы каналізацыі, пракладваюцца трамвайныя шляхі, але ня кожны ведае, колькі мы на гэта затрачаем сродкаў. Возьмем да прыкладу нашу каналізацыю—да бягучага году на будаўніцтва апошняй затрачана звыш 800 тысяч руб. Яшчэ ў гэтым сэзоне ў каналізацыйную сетку будзе ўключана 64 домаўладаньні з 660 кватэрамі. Праўда, не хапае некаторых матар'ялаў аблямаваньня дамавой каналізацыі, усё-ж ёсьць надзея, што праграма работ бягучага году будзе выканана поўнасьцю і ў першых днёх лістапада пачнецца эксплёатацыя каналізацыі. У лістападзе мы будзем сьведкамі яшчэ адной перамогі на фронце будаўніцтва і дабрабыту гораду, але работы па пабудове каналізацыі будуць весьціся і ў наступным годзе. У будучым годзе на будаўніцтва каналізацыі мяркуецца затраціць звыш мілёна рублёў.

Хутка будзем езьдзіць на трамваі.

Ці даўно мы чулі скрыпаньне дапатопнай конкі, якая поўзала, як чарапаха. На хаду садзіліся, на хаду зьлазалі; коням не над сілу цягнуць „вагон", пасажыры вылязаюць і агульнымі сіламі рухаюць конку з „цяжкага месца". Усё гэта было, а зараз здаецца байкай.

Конку зьмяніў аўтобус, але і ён не задавальняе пашыраючыйся Менск. Зараз мы зьяўляемся сьведкамі вялізарнага будаўніцтва,—будуецца трамвай.

Сетка трамвайных рэек ужо пракладзена: таварная МБВ—Камароўка і пасажырскі вакзал—пляц Волі. Устанаўліваецца паветраная лінія, будуецца электра-падстанцыя, якая будзе гатова да 15 верасьня. У верасьні прыбудуць 16 вагонаў і ў канцы верасьня мы будзем сьведкамі, ды ня толькі сьведкамі, але і пасажырамі трамваю.

Праграма гэтага году будзе выканана з перавышэньнем, бо будзе яшчэ зроблена работа па пракладцы рэек па шляху пляц Волі—Старажоўка.

У студзені па Менску будзе курсыравацьць ужо 20 трамвайных вагонаў. У наступным годзе будзе пабудавана лінія—пасажырскі вакзал—Серабранка, будзе таксама пабудавана і лінія Камароўка—с.-гасп. выстаўка. Наогул, на пабудову трамваю ў будучым годзе будзе затрачана 1,117 тысяч рублёў.

Новы год—год далейшых перамог па дабрабыту.

Ідуць і другія ня менш важныя работы па дабрабыту гораду. Брукуецца шэраг вуліц, рамантуюцца масты, будзе досыць значна павялічана вулічнае асьвятленьне і г. д. і г.д. На ўсё гэта сёлета Менск затраціць звыш 86 тысяч рублёў.

Новы год абяцае ў галіне дабрабыту гораду даць далейшыя перамогі. Плянам прадугледжваецца пабудаваць жалезабэтонны мост на Сьвіслачы, вуліцы Ленінская і частка Савецкай будуць забрукованы брушчаткай. Больш 140 тысяч рублёў камгас затраціць на брукаваньне і рамонт іншых вуліц гораду.

Тры грамадзкіх прыбіральні на пляцу Парыскай Камуны, пляцу Волі і Сьвярдлоўскім бавары, дзевяць вулічных пісуараў у розных мясцох гораду—забачуць менчане ў будучым годзе.

Шмат яшчэ чаго прадбачыць плян дабрабыту гораду ў будучым годзе: рамонт садоў і сквэраў, новыя дрэванасаджэньні, рамонт ходнікаў, пашырэньне вулічнага асьвятленьня на рабочых акраінах і г. д. і г. д.

В. З—ў.

Кіно-сад „Чырвоная Зорка".

„Залатая дзюба".

„Залатая дзюба" мае бясспрэчныя станоўчыя бакі.

Гэты фільм—на гістарычную тэму, але наўпроці дрэннаму звычаю, які ўстанавіўся ў кінематографіі, здымае апэрэтачную мішуру з гістарычнасьці. Рэжысэрам Чарвяковым зьняты вэлюм з раскошы магнатаў і паказана, як стваралася гэтае багацьце—шляхам больш чым патагоннае сыстэмы ў рабоце на тагочасный „фабрыцы"—мануфактуры і на полі.

Сюжэтным асяродзьдзем для фільму паслужыла паўстаньне прыгонных сібірскіх кавалёў, якія ня стрываўшы драпежных абыходжаньняў з боку майстроў і ўзбураныя няшчасным выпадкам, узбунтаваліся. Бунтаўшчыкоў адлупцавалі. Тады яны дамовіліся ўцячы на волю—на Катунь, каб тут жыць і працаваць. Але царскае войска пайшло на іх, большасьць пабіла, і толькі чацьвёра ўцяклі. Аб іх стварылася легэнда-казка, якая паслужыла тэмаю для эповесьці Г. Караваевай, паводле якое зроблен фільм.

Аднак, дрэнна тое, што фільм не перадае галоўных момантаў аповесьці, а толькі сваімі сродкамі камэнтуе іх.

Праз гэта выходзіць, што фільм складзены з паасобных кадраў, часамі вельмі моцных (нож у сьпіну здрадніку і інш.) але мала зьвязаных паміж сабою. У фільму бракуе лёгічнасьці, чаму глядачу прыходзіцца дадумываць фільм, што выклікае напружанасьць і робіць яго менш успрыймальным. У фільму ёсьць некаторыя незразумелыя мясьціны. Так, перад экзэкуцыяй невядома кім і да каго зьвернуты словы і „супроць сваіх пайшоў, шэльма"...

Мусім адзначыць рад удалых масавак у фільму, але цяжка меркаваць пра выканаўцаў асобных роляй, хаця ігра артыстых добрая. Справа ў тым, што выканаўца агорнуты як бы „дымавою заслонай" невядома хто што выконвае...

Габ.

Біржа Працы паведамляе.

Менскай Біржай працы вядзецца падрыхтоўчая праца для прыёму дэмабілізаваных чырвонаармеўцаў і камскладу і накіраваньня іх на работу.

У сучасны момант бранёруюцца па ўсім прадпрыемствам і ўстановам месцы асоб 1907 г. нараджэньня, уходзячых у шэрагі РСЧА і РСЧФ, якія будуць запаўняцца зьвяруўшымісяя з арміі. Зьбіраюцца зьвесткі 3 проц. броні для разьмяшчэньня начскладу на адміністрацыйна-гаспадарчыя і тэхнічныя пасады. Запатрабаваны зьвесткі ад Белсельсаюзу, аб маючыхся свабодных месцах па камгасах і калгасах для разьмяшчэньня дэмабілізаваных. Аслабанецца і падрыхтоўваецца інтэрнат для дэмабілізаваных на 40 ложак.

Адначасова паведамляецца, што ўсе дэмабілізаваныя і камскład, які адмаўляецца ад прапанаванай ім сталай працы, у другі раз свайго адмаўленьня будуць здымацца з вучоту дэмабілізаваных і накіроўвацца ма працу на агульных падставах з усімі беспрацоўнымі.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 15-га ЖНІЎНЯ 1929 г.

	Куп.	Прад.
1 6 проц. выйгр. паз.	4.86,5	—
Бяспроц. выйгр. паз. 26 г.	128.75	130.75
Выйгр. пазыка 1929 г.	101.10	101.50
10 проц. выйгр. пазыка 1927 г.	26.28	26.38
3-я сялянск. выйгр. паз. 1927 г.	5.01	—
Дзярж. паз. узм. сял. гас.	10.64	10.69
1 выйг. паз. індустр. 27 г.	25.97	26.07
2 „ „ „ проц.	26.66	26.76
„ „ „ 6-проц.	25.55	25.65
II проц. дзярж. паз. 28 г.	105.01	105,08
12 проц. рэнтная пазыка 1927 г.	102.48	—

Апавяшчэньні

— У пятніцу, 16 жніўня, а 7 гадзіне ўвечары сялянская нарада ў АПА ЦК КП(б)Б з наступным парадкам дня:

1. Інфармацыя т. Каплана аб становішчы працы вытворчых нарад.
2. Інфармацыя т. Клімчука аб папулярызацыі законаў ураду СССР на вытворчых нарадах, ува ўсёй сыстэме культ. масавай работы.

(Дакладчыкам прапануецца прадставіць праэкт рэзалюцыі па сваім дакладам).

Культ. Аддзелу ЦСПСБ выклікаць на гэтую нараду ўсіх загадчыкаў Культ. Аддзеламіі ЦП Саюзаў.

ВСНГ выклікаць на гэтую нараду прадстаўнікоў трэстаў.

Нам. Заг. АПАД ЦК КП(б)Б. **ВАРОНЧАНКА**

Дом Працасьветы.

Бібліятэка адчыняецца 25 жніўня і будзе працаваць ад 4 да 8 г. ув., акрамя панядзелка. Біліярд адчыняецца 15 жніўня.

Часова выкон. абавязкі адказнага рэдактара П. ШАСТАКОЎ.

ТЭАТР—КІНО

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР.
ГАСТРОЛІ МУЗЫЧНАЙ КАМЭДЫІ
Чацьвер, 15-га жніўня
„БЕЛАЯ МОЛЬ" у 3-х дзеях АШКІНАЗІ.
ПАЧАТАК А 9-й ГАДЗІНЕ.
ПЯТНІЦА, 16 ЖНІЎНЯ.
ПРЭМ'ЕРА! „ЦЫГАНСКАЯ ЛЮБОВЬ". ПРЭМ'ЕРА!
У 3-х ДЗЕЯХ. ЛЕГОРЫ.

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА", З аўторка, 13 жніўня. МАСТАЦКІ ФІЛЬМ „НАВАЛЬНІЦА". У 6 частках. Звыш праграмы: КІНО-ХРОНІКА № 37.

КІНО-САД «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» Савецкая № 71. З 13 жніўня. Вялікі мастацкі гістарыч. баявік з эпохі панаваньня Паўла I. „ЗАЛАТАЯ ДЗЮБА". Штодня 2 сэансы, пачатак: 1-га—9 г. 15 х. 2-га—10 г. 45 х. Каса а 7 гадз.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». Выключны мастацкі баявік па аповесьці „Бурлачка" Негуалевіцкага. „ВАСІЛІНА". Драма ў 6 частках. Звыш праграмы: Хроніка Белдзяржкіно № 18

Беларуск. Дзяржаўн. Выдавецтву патрэбны для зьдзельнай работы СТЫЛІСТЫЧНЫЯ РЭДАКТАРЫ, якія ДАСКАНАЛА-б ведалі БЕЛАРУСКУЮ МОВУ. Аплата ад 7 да 10 р. за аркуш.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ. ЗАМЕЖНЫ ФІЛЬМ „ГОРНАЯ БАЛЯДА". Драма ў 7 частках з пралёгам. Пачатак а 7 гадз. 15 хв. Каса а 6 г.

1-Ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР „ЮНЫ ПРАЛЕТАРЫ" „АДРАС ЛЕНІНА". Штодня 2 сэансы: у 3 з паловай і 5 гадзін. Каса—ад 2-х гадз. Па нядзелях ад 12 г. дню.

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
АБВЯШЧАЕ ТЭМЫ НА НАВУКОВА-ПАПУЛЯРНЫЯ МАСАВЫЯ КНІЖКІ.
1. СЭРЫЯ
„Жывая і няжывая прырода"
А) „ЯКІМІ КАРЫСНЫМІ ВЫКАПНЯМІ БАГАТА БССР".
Б) „ФЛЁРА І ФАУНА БЕЛАРУСКІХ БАЛОТ".
В) „ФАЎНА ВОДНЫХ БАСЭЙНАЎ БССР".
Г) „ВОРАГІ І ПРЫЯ